ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ВЕРАСНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 172 (27782) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЦТ: балем правіць бал?

Птушка ў хаце — рай у душы

БРЭНДавыя справы БРСМ

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр САБОДЗІН, фінансавы аналітык:

«У апошні час Нацыянальны банк праводзіць палітыку паступовага зніжэння стаўкі рэфінансавання, каб павысіць даступнасць крэдытных сродкаў для прадпрыемстваў і паскорыць развіццё эканомікі. Як вынік, зніжаюцца і стаўкі па рублёвых дэпазітах. Аднак, паводле апошніх звестак, іх узровень працягвае заставацца нашмат прывабнейшым за валютныя. Так, у ліпені сярэдняя стаўка па новых рублёвых дэпазітах насельніцтва склала 29,9%, па новых валютных дэпазітах фізічных асоб — 4,4%. Спрэд паміж стаўкамі склаў 25,5%, што цалкам перакрывае гадавыя тэмпы зніжэння курсу беларускага рубля да долара ЗША (15,6%). Таксама працэнты па ўкладах у нацыянальнай валюце перавышаюць і гадавую інфляцыю».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.09.2014 г.

Долар ЗША	10480,00	▲
Еўра	13550,00	▲
Рас. руб.	282,00	▼
Укр. грыўня	812,40	▲

ISSN 1990 - 763X

«У КОЖНАГА БЫЦЬ ПАВІННА СВАЯ БАРАВІНА...»

МЕСЦА, ДЗЕ МОЖНА АДПАЧЫЦЬ ДУШОЙ, «ПАЛЯЖАЦЬ ПАД ВЫСОКАЙ САСНОЙ, ПАРАДНІЦЬ ВОЧЫ З НЕБАМ». А Ў ЦЁПЛЫМ, ВІЛЬГОТНЫМ, ЯК СЁЛЕТА, ВЕРАСНІ НАБРАЦЬ БАРАВІКОЎ І ЗБІЦЦА ПАСЛЯ З ЛІКУ, ПАДСУМОЎВАЮЧЫ ГРЫБНЫ ЎРАДЖАЙ, — ЗУСІМ ЯК У ДЗЯЦІНСТВЕ. МОЖА, ГЭТА І ЁСЦЬ ШЧАСЦЕ?

Фота БЕЛТА.

■ Далёкае — блізкае

Энергетычная «бітва» мясцовага ўзроўню

Выйграць яе — значыць у будучыні жыць у бяспецы

У Мар'інай Горцы прэзентавалі план дзеянняў для ўстойлівага энергетычнага развіцця Пухавіцкага раёна, праца над якім вялася з 2012 года ў рамках праекта «Прасоўванне энергазберагальных тэхналогій і аднаўляльных крыніц энергіі на мясцовым узроўні». Адмысловую праграму з усімі падлікамі зрабілі спецыялісты Цэнтра экалагічных рашэнняў пры падтрымцы Пухавіцкага райвыканкама.

СЭКАНОМІЦЬ ЭКАЛАГІЧНА

Не сакрэт, што рэсурсы заканчваюцца: прыкладна падлічаны даты, калі ў свеце скончацца неаднаўляльныя нафта і газ. Эколагі прапануюць ужо сёння актыўна пераходзіць да альтэрнатывы: зберагаць энергію і выкарыстоўваць аднаўляльныя крыніцы.

«Бітва за энергетычную бяспеку будучыні і здаровае навакольле будзе выйграна альбо прайграна менавіта на мясцовым узроўні», — з гэтай фразы супрацоўнік ЦЭР Дзмітрый БУРОНКІН пачаў прэзентацыю плана. Экалагічную эстафету ў Беларусь перадалі краіны Еўрасаюза. Прыкладам для гэтага праекта стала прынятая ў 2008 годзе агульнаеўрапейская стратэгія «20–20–20».

СТАР. 3

■ Знешнепалітычны вектар

АФРЫКАНСКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Нігерыя можа стаць нашым новым стратэгічным партнёрам

Беларусь плануе стварыць зборачныя вытворчасці айчыннай тэхнікі ў Нігерыі. Ёсць перспектывы ўзаемадзеяння таксама і ў сферах вытворчай кааперацыі і гандлю. Гэтыя і многія іншыя пытанні абмеркаваў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ з прэзідэнтам і міністрамі Нігерыі падчас першага за гісторыю двухбаковых стасункаў афіцыйнага візіту ў гэту краіну.

ГУДЛАКА ДЖАНАТАНА ЗАПРАСІЛІ Ў БЕЛАРУСЬ

Як паведамілі ў прэс-службе МЗС, у склад нашай дэлегацыі ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў, Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, Мінскага аўтамабільнага завода, Мінскага трактарнага завода і іншых беларускіх прадпрыемстваў.

У рамках візіту кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства быў прыняты прэзідэнтам Нігерыі Гудлакам Джанатанам. Падчас гутаркі яны абмеркавалі пытанні актывізацыі двухбаковых сувязяў у палітычнай, гандлёва-эканамічнай, ваенна-тэхнічнай і іншых сферах. Уладзімір Макей перадаў кіраўніку Нігерыі асабістае пасланне Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з запрашэннем наведаць Беларусь.

Міністр замежных спраў нашай краіны сустрэўся і са сваім нігерыйскім калегам — Амінам Валі. Кіраўнікі дыпламатычных ведамстваў дамовіліся аб далейшым развіцці ўзаемадзеяння паміж краінамі ва ўсіх сферах, каб вывесці супрацоўніцтва на ўзровень стратэгічнага партнёрства. Прынята рашэнне аб аператыўным разглядзе праектаў пагадненняў аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве і аб заахвочванні і ўзаемнай абароне інвестыцый, якія знаходзяцца на разглядзе нігерыйскай боку. Кіраўнік беларускага МЗС падрабязна праінфармаваў калегу аб планах нашай краіны па стварэнні зборачных вытворчасцяў беларускай трактарнай, сельскагаспадарчай і аўтамабільнай тэхнікі ў Нігерыі.

Падчас сустрэчы з саветнікам па нацыянальнай бяспецы Нігерыі абмяркоўваліся перспектывы стасункаў краін у ваенна-тэхнічнай сферы. Бакі канстатавалі, што адным з небяспечных глабальных выклікаў, якія стаяць сёння ў міжнародным парадку дня, з'яўляецца міжнародны тэрарызм. Дасягнута дамоўленасць у рамках двухбаковых адносін аб больш цесным узаемадзеянні па барацьбе з ім, а таксама аб шчыльным узаемадзеянні ў шматбаковым фармаце.

Вялікай папулярнасцю ў Нігерыі з часоў існавання Савецкага Саюза карыстаюцца беларускія трактары і грузавая аўтатэхніка. У некаторых рэгіёнах краіны беларускія трактары працуюць з 1980-х гг.

Знаходзячыся ў Нігерыі, Уладзімір Макей правёў «круглы стол» з удзелам прадстаўнікоў беларускіх экспарцёраў, афіцыйных дылераў айчынных прадпрыемстваў у Нігерыі, а таксама нігерыйскіх дзелавых колаў. Па інфармацыі прэс-службы Міністэрства замежных спраў, былі абмеркаваны перспектывы далейшага развіцця гандлёва-эканамічных адносін паміж дзвюма краінамі, пытанні выхаду на канкрэтныя двухбаковыя праекты, а таксама асобныя праблемныя пытанні экспарту беларускай прадукцыі ў Нігерыю. У рамках «круглага стала» адбылося падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Беларускай гандлёва-прамысловай палатай і Нігерыйскай асацыяцыяй гандлёва-прамысловых, горназдабыўных і сельскагаспадарчых палат. Пагадненне прадугледжвае актывізацыю работы па падрыхтоўцы і правядзенні ўзаемных візітаў дзелавых колаў, пошуку гандлёва-эканамічных партнёраў, абмену камерцыйнымі прапановамі.

Важнымі складнікамі бюджэту Нігерыі з'яўляюцца турызм і... кіно.

НАФТА, СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА І... КІНО

Федэратыўная Рэспубліка Нігерыя ў апошнія гады здзіўляе эканамістаў і палітолагаў імклівым ростам валавога ўнутранага прадукту і паступовым ростам уплыву на палітыку рэгіёна. Летась эканоміка гэтай краіны стала найбуйнейшай у Афрыцы, за адзін 2013 год яе ВУП вырас амаль на 90%! Сёння Нігерыя па гэтым паказчыку займае 26 месца ў свеце, яшчэ адно намаганне — і яна дагоніць краіны Вялікай дваццаткі.

Найбольш прыбытковым сектарам эканомікі дзяржавы з'яўляецца нафтавы. Нігерыя — адзін з асноўных пастаўшчыкоў гэтай сыравіны ў Заходнюю Еўропу, таксама яна займае пятае месца па пастаўках нафты ў ЗША. Акрамя гэтага, у краіне здабываюць вугаль, волава, калумбіт. Развіваецца сельская гаспадарка — менавіта ў ёй занята большая частка працоўных у краіне. Па гэтай прычыне будаўніцтва беларускіх зборачных вытворчасцяў сельскагаспадарчай тэхнікі прынясе прыкладна аднолькавую карысць і нам, і нігерыйцам.

Важнымі складнікамі бюджэту Нігерыі з'яўляюцца турызм і... кіно. У краіне ёсць трапічныя лясы, саваны, вадаспады, мноства аб'ектаў, якія маюць культурнае і гістарычнае значэнне. Аднак людзям, якія імкнуцца да афрыканскай экзотыкі, неабходна памятаць: шэраг рэгіёнаў краіны пакутуе ад недахопу электраэнергіі, дрэннай якасці дарог і бруднай пітной вады. Што да кінематаграфіі, Нігерыя знаходзіцца на другім месцы ў свеце па колькасці поўнаметражных фільмаў, што выпускаюцца, саступаючы толькі Індыі. Нігерыйскую кінаіндустрыю па аналогіі з Галівудам называюць Налівудам. Сярэдні кошт вытворчасці поўнаметражнай кінастужкі ў Нігерыі складае каля 15 тыс. долараў, вялікай папулярнасцю там карыстаюцца баевікі з простым сюжэтам.

АФРЫЦЫ ПАТРЭБНЫ ТРАКТАРЫ

Беларускае пасольства ў Абуджы, сталіцы Нігерыі, было адкрыта ў 2011 годзе.

На прэс-канферэнцыі, якую Уладзімір Макей правёў для вядучых СМІ гэтай краіны, міністр замежных спраў назваў Нігерыю «акном» для Беларусі ў рэгіён Заходняй Афрыкі.

— Нашы эканомікі з'яўляюцца ўзаемадапаўняльнымі, — падкрэсліў у сваім выступленні Уладзімір Макей. — У Беларусі ёсць добра развітая прамысловасць. Мы вырабляем трактары, седлавыя цягачы, грузавыя аўтамабілі, кар'ерныя самазвалы, сельскагаспадарчую тэхніку. У нас дастаткова вопыту ў сферы высокіх тэхналогій. Такім чынам, існуе мноства відаў прадукцыі, якую мы вырабляем і ў якой мае патрэбу Нігерыя. У той жа час у вас ёсць шмат тавараў і прадукцыі, у якіх мае патрэбу Беларусь.

Уладзімір Макей і прэзідэнт Нігерыі Гудлак Джанатан.

Пакуль што асноўнымі экспарцёрамі ў гэту краіну з'яўляюцца Беларуская калійная кампанія, Беларускі металургічны завод, Мінскі аўтамабільны завод, «Белшына». «Гродна Азот», а таксама прадпрыемствы канцэрна «Белдзяржхарчпрам»... Аснову беларускага экспарту ў Нігерыю на працягу апошніх гадоў складаюць нафтапрадукты, калійныя і азотныя ўгнаенні, паліграфічная прадукцыя, прадукцыя прыборабудавання. Вялікай папулярнасцю ў Нігерыі з часоў існавання Савецкага Саюза карыстаюцца беларускія трактары і грузавая аўтатэхніка. У некаторых рэгіёнах краіны беларускія трактары працуюць з 1980-х гг. Грунтуючыся на гэтым факце, наша пасольства яшчэ ў 2012 годзе ініцыявала прапрацоўку праекта па стварэнні зборачнай вытворчасці беларускай трактарнай тэхнікі на тэрыторыі гэтай афрыканскай дзяржавы. З Нігерыі ж мы завозім каўчук, какава-бабы, садавіну, спецыі, расліны для касметычнай і фармацэўтычнай прамысловасці, скуру.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПЕРЕНОСЕ ТОРГОВ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот № 1. Изолированное помещение – торговое помещение, с инв. № 200/D135301, общей площадью 124,4 м.кв., стоимостью 1 297 886 000 бел. рублей. Лот № 2. Пресс для установки кнопок DEP-2, инв. № 8190, стоимостью 2 485 280 бел. рублей. Лот № 3. Прямострочная машина FY3800B, с инв. № 8069, стоимостью 1 684 619 бел. рублей. Лот № 4. Швейная машина без мотора FY600-1, с инв. № 8150, стоимостью 1 380 622 бел. рубля. Лот № 5. Швейная машина ZJ5550 с инв. № № 8131, стоимостью 744 918 бел. рублей. Лот № 6. Швейная машина ZJ5550 с инв. № № 8132, стоимостью 744 918 бел. рублей. Лот № 7. Швейная машина ZJ5550 с инв. № № 8133, стоимостью 744 918 бел. рублей. Лот № 8. Швейная машина ZJ5550 с инв. № № 8134, стоимостью 744 918 бел. рублей. Лот № 9. Швейная машина ZJ5550 с инв. № № 8135, стоимостью 744 918 бел. рублей. Лот № 10. Швейная машина ZJ5550 с инв. № № 8136, стоимостью 744 918 бел. рублей. Лот № 11. Швейная машина ZJ5550 с инв. № № 8137, стоимостью 744 918 бел. рублей. Лот № 12. Комплект для ВТО Comelc инв. № 8148, стоимостью 2 995 487 бел. рублей. Лот № 13. Пресс для установки кнопокDEP-2, инв. № 8191, стоимостью 2 156 000 бел. рублей. Лот № 14. Машина швейная Siruba 737K-504M2, с инв. № 8183, стоимостью 5 159 047 бел. рублей. Лот № 15. Швейная машина GP5-1, с инв. № 8102, стоимостью 1 154 043 бел. рубля. Лот № 16. Машина швейная Siruba 737K-504M2, с инв. № 8183, стоимостью 5 159 047 бел. рублей. Лот № 17. Швейная машина (комплект) SUZUKI, с инв. № 8147, стоимостью 16 355 592 бел. рубля. Лот № 18. Плоскошовная машина кл.31016-02BB, инв. № 8207, стоимостью 1 654 661 бел. рубль. Лот № 19. Автомобиль ВАЗ 11183, гос. № 7616АХ-2, инв. № 8065, стоимостью 12 766 470 бел. рублей. Лот № 20. Автомат для выдачи горячих напитков COLIBRIC5 AF-R/RUSQ, с инв. № 8179, стоимостью 9 291 605 бел. рублей.
Собственник (владелец) имущества	ОАО «Витебский рассвет» (УНН 390143025)
Местонахождение (адрес) имущества	Лот № 1: г. Витебск, ул. Космонавтов, 13-82б; Лот № 2–12: г. Витебск, ул. Суворова, 6; Лот № 13–14: г. Витебск, пр. Фрунзе, 72; Лот № 15: г. Витебск, ул. Космонавтов, 13; Лот № 16–20: г. Витебск, ул. Я. Купалы, 6
Наличие обременений	Лот № 1: залог ЧПТУП «Промышленный трикотаж»; Лот № 2–20: залог ОАО «Белинвестбанк»
Место (адрес), дата и время проведения торгов	07.10.2014 в 11.00 г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 320
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Правды, д. 34. Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс (80212) 607106, начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212)600975
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет Главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО СБ «Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 11.00 06.10.2014 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

УРАЧАМ — АД ПАЛІЦЭЙСКІХ

У сераду па тэрыторыі Беларусі прайшла міжнародная паліцэйская гуманітарная калона «Moto for peace». Удзельнікі прабегу — афіцэры паліцыі Італіі, Іспаніі, Германіі, Бельгіі, Нарвегіі, Расіі, Турцыі, Лівіі, Эквадора — такім чынам удзельнічаюць у акцыі «Урачы на матацыклах у Непале», якая стартавала 31 жніўня ў Рыме.

Паліцэйскія праехалі праз Аўстрыю, Чэхію, Польшчу, а пасля Беларусі накіруюцца ў Расію, Казахстан, Кыргызстан, Кітай і ўрэшце ў Непал. Фініш у Катманду запланаваны на 21 кастрычніка. За 53 дні падарожжа давядзецца пераадолець каля 14 тысяч кіламетраў.

Бернарда Летурэ, супрацоўнік нацыянальнай італьянскай паліцыі, які служыць у Рыме і з 2001 года з'яўляецца прэзідэнтам гуманітарнай матацыклетнай арганізацыі, кажа, што падобныя сусветныя туры скіраваны на падтрымку насельніцтва, якое пражывае ў неспрыяльных умовах. Сёлета гуманітарная місія заключаецца ў перадачы ўрачам Непала 10 матацыклаў і медыцынскага абсталявання. Расходы цалкам пакрываюцца самой арганізацыяй «Moto for peace» за кошт узносаў яе заснавальнікаў — супрацоўнікаў нацыянальнай італьянскай паліцыі, а таксама іншых членаў з ліку прадстаўнікоў Еўропы і Афрыкі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЭЛІТАРНАЯ ШКОЛА ДЛЯ ЮНЫХ МАТЭМАТЫКАЎ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце адкрываецца новы адукацыйны сезон «Школы юнага матэматыка».

Гэта бясплатныя вучэбныя курсы, якія арганізуюцца механіка-матэматычным факультэтам БДУ для розных катэгорый школьнікаў. Так, вучні 5—8 класаў змогуць падрыхтавацца да рэспубліканскага матэматычнага конкурсу «Кенгуру» і алімпіяд. Для старшакласнікаў прадугледжаны заняткі па вывучэнні школьнай праграмы на паглыбленым узроўні і падрыхтоўцы да паступлення на факультэты матэматычнага профілю. Выпускнікі школ змогуць удасканаліць свае веды і ўменні ў рашэнні задач цэнтралізаванага тэсціравання і стаць удзельнікам вочнай алімпіяды па матэматыцы «Абітурыент БДУ». Дарэчы, прызёры гэтых спаборніцтваў пры роўнай колькасці набраных балаў будуць мець пераважнае права пры залічэнні на любую спецыяльнасць механіка-матэматычнага факультэта.

Навучаць школьнікаў будуць выкладчыкі механіка-матэматычнага факультэта. Заняткі арганізуюцца раз на тыдзень па суботах у аўдыторыях галоўнага корпуса БДУ. Запіс на курсы да 20 верасня. Новы навучальны год «стартуе» ў школе 27 верасня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАРУШАЛЬНІКАМ МЯЖЫ АКАЗАЛАСЯ... КАРОВА

На ўчастку Брэсцкай памежнай заставы спрацаваў сігналізацыйны комплекс. Прыбыўшы на ўчастак, вартавыя мяжы ўбачылі на кантрольна-следавой паласе карову, якая хадзіла вакол агароджы.

Як высветлілася пазней, рагуля адбілася ад статка на тэрыторыі суседняй Польшчы, перайшла дзяржаўную мяжу і аказалася ў Беларусі. У той жа дзень у прысутнасці польскіх калег беларускія памежнікі перадалі рагатую «парушальніцу» шчасліваму жыхару адной з памежных польскіх вёсак. Як заўважылі ў прэс-службе Чырванасцяжнай памежнай групы імя Ф. Дзяржынскага, рагатыя, хвастатыя, ікластыя «парушальнікі» становяцца звычайнай справай на мяжы. Дзікіх жывёл, вядома, не затрымліваюць, яны свабодна выбіраюць сабе краіну пражывання. А вось свойскіх часам даводзіцца «дэпартаваць» і перадаваць у рукі гаспадара.

Яна СВЕТАВА.

ПАВЕТКА ЎПАЛА НА ПЕНСІЯНЕРКУ

У Навагрудскім раёне відавочцы выратавалі пажылую жанчыну, на якую абрынулася паветка для дроў.

Удзень на тэрыторыі прыватнага дома ў вёсцы Несутычы праводзіўся дэмантаж гэтага самага навеса памерам 3х5 метраў. І пад завалам аказалася пенсіянерка... Да прыбыцця падраздзялення МНС жанчыну дасталі суседзі. Пацярпелую шпіталізавалі ў Навагрудскую цэнтральную раённую бальніцу з падазрэннем на пераломы і пашкоджанне пазваночніка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Энергетычная «бітва» мясцовага ўзроўню

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Згодна з ёй, да 2020 года агульныя энергазатраты ў краінах ЕС павінны скараціцца на 20%, доля энергіі ад аднаўляльных крыніц — вырасці да 20%, а ўзровень выкідаў вуглякіслага газу ў атмасферу таксама павінен скараціцца на 20%. Такім чынам, галоўная ідэя беларускага праекта дублюе еўрапейскую канцэпцыю: ужо сёння неабходна скараціць энергазатраты і выкіды вуглякіслага газу ў атмасферу, выкарыстоўваць больш аднаўляльных крыніц энергіі.

Нагадаем: праект праводзіцца ў трох эксперыментальных рэгіёнах Беларусі — Браслаўскім, Шчучынскім і Пухавіцкім. Дарэчы, план неаднаразова абмяркоўваўся і карэкціраваўся, бо ў кожнага жыхара была магчымасць прапанаваць свае варыянты і ідэі.

АРЫФМЕТЫКА ЭКАНОМІІ

Нядаўна Пухавічы далучыліся да праграмы «Пагадненне мэраў» — ініцыятывы ЕС, удзельнікі якой прымаюць на сябе добраахвотныя абавязкі развіваць энергетычны сектар у сваім муніцыпалітэце. Падпісваючы гэтае пагадненне, мясцовыя ўлады гарантуюць забяспечыць да 2020 года скарачэнне выкідаў CO_2 шляхам павышэння энергетычнай эфектыўнасці і інвестыцый у аднаўляльныя крыніцы энергіі. Дарэчы, Пухавічы сталі дзясятым беларускім горадам, які далучыўся да гэтай ініцыятывы. Акрамя таго, мясцовыя ўлады ўзялі на сябе абавязак павялічыць долю аднаўляльных крыніц энергіі да 40%, а гэта даволі вялікі паказчык. Удзел у ініцыятыве дае магчымасць атрымліваць еўрапейскія гранты на рэалізацыю праектаў.

Полацк і Навагрудак першымі далучыліся да «Пагаднення мэраў» і ўжо маюць распрацаваныя планы. На іх падыходы і арыентаваліся эколагі. Праграма дзеянняў падрыхтавана, але што на самой справе чакае Пухавіцкі раён? Плануецца ажыццявіць 49 мерапрыемстваў, якія, па падліках спецыялістаў, прывядуць мясцовасць да жаданага скарачэння энергазатрат на 20%. Са спіса мясцовых відаў паліва эколагі «выключылі» торф, бо пры спальванні ён выдае вялікую колькасць выкідаў CO_2. Гэта не азначае, што ў раёне цалкам адмовяцца ад гэтага рэсурсу: спецыялісты прапануюць пакінуць яго спажыванне на тым жа ўзроўні і часткова замяніць на драўніну. Напрыклад, на тэрыторыі міжнароднага экалагічнага парку «Волма» ёсць плантацыі вярбы, дзе дрэвы вырастаюць за некалькі гадоў, а пасля перамолваюцца ў трэскі. Хіба не выдатная замена газу?

Мясцовыя ўлады ўзялі на сябе абавязак павялічыць долю аднаўляльных крыніц энергіі да 40%, а гэта даволі вялікі паказчык.

«Будаўніцтва біягазавых комплексаў на фермах запатрабуе 40% ад памеру інвестыцый і такі ж атрымаецца эфект энергазбяражэння, — падсумаваў супрацоўнік энергетычнай кампаніі ЦЭР Арцём БЫСТРЫК. — А вось сонечныя панэлі акупяцца не хутка, бо, па падліках, 20% інвестыцый у гэтую тэхналогію прынясуць усяго 5% эфекту». Тым не менш запланавана ўсталяванне сонечных калектараў на адміністрацыйных будынках, будаўніцтва міні-ЦЭЦ і біягазавага комплексу на ачышчальных канструкцыях і міні-ЦЭЦ, рэканструкцыя кацельняў.

Цяпер для рэалізацыі праграмы трэба шукаць інвестыцыі. Праект доўгатэрміновы, а гэта дае падставу заяўляць пра свае патрэбы і знаходзіць інвестараў. Першыя паказальныя мерапрыемствы будуць праведзены на працягу восені бягучага года.

«ЯК ГЭТА ПРАЦУЕ?»

Здаецца, усё ўжо было падлічана і падсумавана, але прэзентацыя даведзенага да ладу плана ледзь не пераўтварылася ў гарачую дыскусію. Настаўнік фізікі з гарадскога пасёлка Праўдзінскі прапанаваў выкарыстоўваць водныя рэсурсы і пабудаваць на рацэ Пціч міні-ГЭС. А цеплапомпавае абсталяванне ён настойліва рэкамендаваў замяніць на кавітацыйныя рухавікі (працэс кавітацыі — стварэнне газавых бурбалак пры паніжэнні ціску ў вадкасці — мае цеплавы эфект). Цікава, што на абмеркаванні плана мерапрыемстваў спецыяліста не было, але заўвагі настаўніка сапраўды аказаліся разумнымі. Таму эколагі абмяняліся кантактамі з ім і, магчыма, унясуць праўкі ў існуючы план.

Са спіса мясцовых відаў паліва эколагі «выключылі» торф, бо пры спальванні ён выдае вялікую колькасць выкідаў CO_2. Гэта не азначае, што ў раёне цалкам адмовяцца ад гэтага рэсурсу.

Шмат пытанняў пухавічане задавалі і па энергазберагальнай выставе, якую прывезлі спецыялісты. Кансультант у галіне энергазбяражэння ЦЭР Антон ГАХОВІЧ літаральна на пальцах тлумачыў розніцу паміж светадыёднай, энергазберагальнай лямпачкамі і лямпачкай напальвання. Пры гэтым ён не рабіў рэкламу аднаго прадукту, а запрашаў выбраць найбольш падыходзячы варыянт пад кожную патрэбу і тып памяшкання. Спецыяліст прэзентаваў экалагічныя гаджэты: цеплавізар, што паказвае зоны ў памяшканні, праз якія ўцякае цяпло; люксометр, якім памераў якасць асвятлення, і гігрометр для вызначэння працэнта вільгаці. Гэтыя стандартныя працэдуры дазваляюць выявіць, наколькі энергаэфектыўнае памяшканне і наколькі яно бяспечнае для здароўя. Між іншым, спецыялісты арганізацыі праводзяць бясплатныя праверкі — заказаць паслугу можна, калі набіраецца кампанія з пяці ахвотных. Магчымасць пакратаць і паглядзець, «як гэта працуе», вельмі спадабалася наведвальнікам мерапрыемства, і ў нефармальных абставінах пухавічане атрымалі карысныя экалагічныя веды. Эфект ад супрацоўніцтва мясцовай улады і эколагаў відавочны, але цяпер справа за рэальнымі дзеяннямі.

Кацярына РАДЗЮК.

■ Шляхамі веры і духоўнасці

САД КАЛЯ ЧЫСТЫХ КРЫНІЦ

1

2

Пасадка маленькіх яблынек, дубкоў, ліпак, бярозак — знакавая і ўрачыстая частка работы навукова-творчай экспедыцыі «Дарога да святыняў» з Дабрадатным агнём ад Гроба Гасподняга. Такі сімвалічны Сад малітвы вось ужо дваццаць адзін год папаўняецца новымі саджанцамі, прырастае новымі алеямі ў вёсках і гарадах.

Супольнае набажэнства. Перадача іерусалімскага нязгаснага агню кожнаму ўдзельніку сустрэчы з экспедыцыяй. Агульны ўдзел у пасадцы Саду малітвы. У такім парадку адбываецца тое, дзеля чаго на сустрэчу экспедыцыі прыходзяць мноства жыхароў буйных гарадоў і маленькіх вёсачак. Зрэшты, справа не толькі ў іх колькасці. Справа ў тым, як успрымае кожны магчымасць пасадзіць дрэва і прыняць адказнасць за лёс маленькага саджанца. Вось што кажуць самі ўдзельнікі экспедыцыі.

Вясковы настаўнік з Баранавіцкага раёна Іван Лычкоўскі: «Я заўжды расказваю дзятве, што там, дзе прайшла экспедыцыя, паўстаюць-красуюцца дрэўцы новых садоў. Сад для вяскоўца — гэта ва ўсе часы штосьці светлае, сакраментальнае, шматсэнсоўнае…»

Паэт Вадзім Спрынчан: «Мы падсыпаем пад карані кожнага саджанца прыгаршчы зямлі з мясцін, па якіх ужо прайшла экспедыцыя. У гэтай вобразнай дзеі вялікі сэнс: наша зямля яднае нас, і мы адказваем за яе лёс».

Народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Марыя Захарэвіч: «На маёй роднай Мядзельшчыне таксама пасаджаны дрэўцы Саду малітвы. Яны — нашы словы ў агульнай малітве за Беларусь».

3

Нязменная кіраўніца і арганізатар экспедыцыі, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» пісьменніца Ніна Загорская: «Сад нашай супольнай малітвы стаіць на мінулым і расце ў будучыню. Лісце з пасаджаных намі дрэў калісьці ўпадзе на далоні прапаўнукаў…»

— А мой унук Максім ужо сёння даглядае Сад малітвы! — з гонарам расказвае мне ўдзельнік экспедыцыі мінчанін Пётр Забара. — У Валожыне мы вырашылі пасадзіць дрэўцы на вялікім лузе каля святой крыніцы. Саджанцы размясцілі па форме стаметровага праваслаўнага крыжа. На дапамогу экспедыцыі прыйшлі старшакласнікі школы №1, дзе вучыцца мой унук.

Больш за тысячу маладых дрэўцаў высадзілі ўдзельнікі экспедыцыі ў розных месцах Беларусі за дваццаць адзін год. Сёлета адбыўся самы маштабны «зялёны дэсант»: на Святым полі пад Баранавічамі ўдзельнікі дваццаць першай міжнароднай экспедыцыі «Дарога да святыняў» высадзілі 210 маленькіх дубкоў. На тым полі, дзе пахаваныя салдаты, што палеглі ў войнах некалькіх папярэдніх стагоддзяў, паўстане зялёная дуброва беларускага Саду малітвы.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.

На здымках:

1. Удзельнік экспедыцыі Пётр Забара з унукам Максімам у час пасадкі саду.

2. Святая крыніца на лузе, побач з ёй пасаджаны Сад малітвы.

3. Старшакласнікі валожынскай школы разам з мясцовым святаром протаіерэем Дзмітрыем.

ШЭНГЕН-2?

Аб'яднаная віза па тыпу шэнгенскай можа быць уведзена ў межах Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі

Пра гэта паведаміў учора на II Міжнародным бізнес-саміце ў Ніжнім Ноўгарадзе Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота.

«У нас сапраўды пры высокай ступені інтэграцыі візавая палітыка ў кожнага свая, — сказаў дзяржсакратар. — І гэта стварае пэўныя нязручнасці бізнесу і не толькі, бо вельмі часта турыстычныя маршруты перасякаюць мяжу. Карацей кажучы, праблема ёсць».

Рыгор Рапота адзначыў, што ўжо правёў кансультацыі ў міністэрствах замежных спраў дзвюх краін. «Зараз гэтае пытанне прапрацоўваецца. Думаю, што сёлета будуць нейкія першыя сігналы пра тое, наколькі рэальна гэта зрабіць», — дадаў ён.

Дагавор пра стварэнне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі падпісаны 8 снежня 1999 года ў Маскве і ўступіў у сілу 29 студзеня 2000 года. У паўнамоцтвы Саюзнай дзяржавы ўваходзяць знешняя палітыка, абарона і бяспека, бюджэтная, грашова-крэдытная і падатковая сістэмы, мытныя пытанні, сістэмы энергетыкі, транспарту і сувязі. Кожная дзяржава захоўвае суверэнітэт, незалежнасць, тэрытарыяльную цэласнасць, дзяржаўны лад, канстытуцыю, дзяржаўны сцяг і герб.

Шэнгенская віза дае магчымасць наведваць любую з еўрапейскіх краін-удзельніц пагаднення грамадзянам іншых дзяржаў без кантролю на ўнутраных сухапутных, водных і паветраных межах.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Закасаўшы рукавы

АРГАНІЗУЙ СУБОТНІК САМ!

Цягам месяца кожныя выхадныя ў 12 гарадах Беларусі ў рамках сусветнай экалагічнай акцыі «Зробім!» будуць праходзіць маштабныя прыборкі тэрыторый ад смецця.

Старт кампаніі адбудзецца 14 верасня на Мінскім моры. Сёлета далучыцца да акцыі вельмі проста: на сайце greenmap.by будуць пазначацца месцы, якія плануецца ачысціць ад смецця, таксама будуць паказаны ўжо прыбраныя тэрыторыі. Асаблівасць мерапрыемства ў тым, што ў яго няма адзінага каардынатара: кожны ахвотны можа арганізаваць прыборку сваімі сіламі. Для гэтага трэба сабраць кампанію аднадумцаў, пазначыць на карце выбранае месца і папярэдне дамовіцца з мясцовым лясгасам аб вывазе сабранага смецця.

Кацярына РАДЗЮК.

■ Здарэнне

200 ТОН САЛОМЫ ПАДПАЛІЛІ?

Пра здарэнне ў вёсцы Новы Двор Мінскага раёна пажарным-выратавальнікам паведамілі пасля 20 гадзін. Калі праз дзесяць хвілін да месца выкліку прыбылі першыя падраздзяленні МНС, у полі агонь ужо цалкам ахапіў дзве сцірты, якія стаялі на адлегласці тры метры адна ад адной. У кожнай было па 100 тон саломы. Разам з выратавальнікамі на ліквідацыі загарання была задзейнічана тэхніка ўласніка — агракамбіната «Ждановічы». Агонь лакалізавалі за 20 хвілін, але паліваць салому, якая тлела, скончылі амаль у чатыры гадзіны раніцы. У выніку здарэння 200 тон саломы былі пашкоджаны. Мяркуецца, што прычынай пажару стаў падпал.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«МЫ АРАНДАВАЛІ ЗЯМЛЮ Ў НАШЧАДКАЎ»

Парламентарый прапануе ўвесці адказнасць за знясіленне глебы

Фота БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Усю нашу краіну парламентарый Мікалай ІВАНЧАНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, лічыць унікальным прыродным комплексам. Праўда, наўрад ці ЮНЕСКА зможа ўнесці ўсю Беларусь у Спіс сусветнай спадчыны. Пра гэта, а таксама пра зберажэнне зямлі і выкарыстанне меліяраваных зямель, асаблівасці нашых аграсядзіб і тое, чаму электрамабілі на беларускіх дарогах — вельмі далёкая перспектыва, дэпутат расказаў карэспандэнту «Звязды».

— Белавежская пушча ўжо даўно ўключана ў Спіс помнікаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. А якія яшчэ, на ваш погляд, прыродныя славутасці Беларусі павінны папоўніць гэты спіс?

— Я б сказаў, што ўся тэрыторыя нашай краіны — унікальны прыродны комплекс: нашы азёры, рэкі, лясы... Гэта, хутчэй за ўсё, немагчыма рэалізаваць, але наша краіна вартая таго, каб займаць асаблівае месца ў свеце па разнастайнасці прыродных ландшафтаў, што з'яўляецца крытэрыем пры адборы аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Белавежская пушча даўно ўваходзіць у гэты спіс. Што да іншых аб'ектаў, то зрабіць так, каб іх прызналі сусветнай спадчынай, не так проста. Тым не менш зараз у краіне праводзіцца сістэмная праца па пашырэнні спіса такіх аб'ектаў.

У папярэднім спісе мы прадставілі яшчэ шэраг аб'ектаў. З прыродных — гэта Аўгустоўскі канал, а таксама праект па пашырэнні Белавежскай пушчы. Апошні мы прапанавалі ў 2011-м, ён павінен уключаць і беларускія, і польскія тэрыторыі.

Яшчэ адзін цікавы аб'ект — Прыбугскае Палессе. У 2012 годзе яно стала часткай трансгранічнага біясфернага рэзервата і набыла міжнародны статус. Маецца на ўвазе, што Палессе займае часткі тэрыторый трох краін, але ж гэта адзінае ландшафтнае ўтварэнне. Цікавы трансгранічны праект «Паазер'е» зараз рыхтуецца сумесна з Літвой, Латвіяй і Расіяй...

— Плануецца прызнаць, што Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі «Аб зацвярджэнні межаў Дзяржаўнага ландшафтнага заказніка «Навагрудскі» страціла сілу. Чаму?

— Гэта звязана з прывядзеннем нарматыўных актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з заканадаўствам. У свой час вызначэнне межаў ахоўных тэрыторый прадугледжвалася на ўзроўні заканадаўчага органа: Вярхоўнага Савета і Прэзідыума Вярхоўнага Савета. А сёння рэгламентуецца пастановай урада.

Аднак гэта не азначае, што заказнік спыніць сваё існаванне. Наадварот, плошча яго пашырылася. А ўвогуле, увага да ахоўных тэрыторый у краіне будзе толькі павялічвацца.

— У савецкі час вялізныя плошчы балот былі асушаны. Спачатку гэта былі ўраджайныя землі, але пасля многія палі спустошыла эрозія. Паўставала нават пытанне аб паўторным забалочванні... Як сёння выкарыстоўваюцца гэтыя землі? Ці не паспяшаліся ў савецкі час пазбавіцца ад балот?

— Я б пашырыў пытанне. Зямля — гэта галоўнае багацце, якое мы маем. Успрымаць яе трэба не як спадчыну, якая дасталася нам ад продкаў, а як зямлю нашчадкаў. Мы павінны не толькі захаваць яе стан, але і палепшыць яго — павысіць урадлівасць зямлі. Гэта стратэгічная мэта для краіны.

Я ўжо ўносіў ва ўрад прапанову, якая мае на ўвазе юрыдычную адказнасць суб'ектаў гаспадаркі за захаванне ўрадлівасці зямлі. Гаспадарчая дзейнасць не павінна прыводзіць да знясілення глебы. Сёння ёсць дзяржаўныя праграмы па захаванні і памнажэнні ўрадлівасці зямлі. Але яны «заканчваюцца» на ўзроўні рэгіёнаў, не даходзяць да канкрэтных суб'ектаў, якія гаспадараць на зямлі. Гэта неабходна мяняць.

Што да балот, то я не згодны з тым, што іх асушэнне ў савецкія часы было нейкай памылкай. Праграма «Меліярацыя», якая дзейнічала тады, дала вялікі штуршок развіццю эканомікі Палесся і іншых забалочаных тэрыторый. Зямля, атрыманая ў выніку асушэння балот, павінна сёння правільна эксплуатавацца. На гэта звяртае ўвагу і кіраўнік дзяржавы.

Сёння дзейнічае праграма «Торф». Сумесна з Мінскім аблвыканкамам мы літаральна месяц назад унеслі прапанову ўраду (дарэчы, гэта была мая ініцыятыва) разгледзець эфектыўнасць працы гэтай праграмы, бо становішча торфаперапрацоўчых прадпрыемстваў у краіне сёння не самае лепшае. Мы павінны рабіць акцэнт на паглыбленую перапрацоўку торфу: выкарыстоўваць яго не толькі як мясцовую крыніцу паліва (дарэчы, неўзнаўляльную), але і як сродак павышэння ўрадлівасці глебы.

Ва ўрадзе пагадзіліся з нашымі прапановамі па стварэнні прадпрыемства па паглыбленай перапрацоўцы торфу. Бо з торфу можна атрымліваць вельмі вялікую колькасць кампанентаў, якія выкарыстоўваюцца і ў сельскай гаспадарцы, і ў медыцыне, і нават у парфумерыі. Гаворка ідзе аб распрацоўцы тэхніка-эканамічнага абгрунтавання буйной вытворчасці па паглыбленай перапрацоўцы торфу.

Што да паўторнага забалочвання — то гэта таксама прадугледжваецца. Ёсць балоты, дзе праводзіцца праца па рэкультывацыі. Прадугледжваецца вяртанне іх у стан забалочанай тэрыторыі.

Зараз праводзіцца праца па інвентарызацыі балот і асушаных тэрыторый. Гэтым займаецца Міністэрства прыродных рэсурсаў сумесна з мясцовымі органамі ўлады. У наступным годзе такая праца павінна быць завершана. Вынікі інвентарызацыі стануць асновай для распрацоўкі новай дзяржаўнай праграмы выкарыстання меліяраваных тэрыторый, якая будзе прадугледжваць не толькі іх эксплуатацыю, але і захаванне.

Што да балот, то я не згодны з тым, што іх асушэнне ў савецкія часы было нейкай памылкай.

— Да канца года на АЭС, якая будуецца ў Астраўцы, будзе дастаўлены рэактар для першага энергаблока. Узнікалі розныя сумненні... Але ёсць аргументы і за тое, што Астравецкая АЭС палепшыць экалогію краіны. Якая ваша думка па гэтым пытанні?

— Думаю, што альтэрнатывы атамнай станцыі ў нас няма. Неабходнасць у энергіі расце.

Можна параўнаць АЭС з цеплаэлектрастанцыяй. Для таго, каб атрымаць электрычнасць у тым аб'ёме, які можа выпрацаваць АЭС, трэба было б пабудаваць шмат новых цеплаэлектрастанцый. Як вядома, яны працуюць на паліве. Натуральна, што ў такім выпадку, экалагічнае забруджванне ад ЦЭЦ, дакладней, ад сумы гэтых ЦЭЦ, было б нашмат вышэйшым, чым нагрузка на экалогію, звязаная з будаўніцтвам атамнай электрастанцыі. Таму ў гэтым сэнсе выкарыстанне АЭС сапраўды менш уплывае на экалогію.

— У апошнія гады ў нашай краіне дынамічна развіваецца экалагічны турызм. Чый вопыт развіцця гэтага напрамку варта вывучыць і выкарыстоўваць у нас? У чым асаблівасць беларускага экатурызму?

— Добры вопыт развіцця экатурызму, аграсядзіб ёсць у Італіі, Іспаніі, Кіпра, неблагі вопыт ёсць і ў нашых суседзяў — Польшчы.

Нядаўняе наведванне Прэзідэнтам аграсядзіб у Валожынскім раёне Мінскай вобласці паказала, і кіраўнік дзяржавы гэта адзначыў, што аграэкатурызм — адзін з кірункаў адраджэння нашых вёсак, асабліва неперспектыўных.

Скажу, што ў апошнія гады экалагічны турызм у нас развіваецца вельмі дынамічна. Асаблівасць беларускага аграгурызму ў тым, што дзяржава аказвае сістэмную падтрымку тым, хто хоча развіваць гэты бізнес. Адпаведныя ўказы прыняты кіраўніком дзяржавы, ёсць і пастанаўленне ўрада. Аказваецца фінансавая падтрымка па крэдытаванні такіх праектаў. Яшчэ адна цікавінка ў тым, што ў краіне ўжо амаль 2 тысячы аграсядзіб. А развівацца гэта пачало ў 2006 годзе, калі быў прыняты першы Указ Прэзідэнта.

— З кожным годам у беларускіх гарадах становіцца ўсё больш машын, у той час як у Еўропе актыўна прапагандуецца велатранспарт. Ці рэальна ў нас у бліжэйшыя гады запусціць аналагічны праект?

— Думаю, што ў сталіцы такі праект фактычна ўжо пачаў дзейнічаць. Створаны веласіпедныя маршруты, якія выкарыстоўваюцца вельмі актыўна. Вялікая праца праводзіцца і ў сувязі з развіццём веласіпеднай вытворчасці на нашым мотавелазаводзе — выпускаюцца новыя мадэлі адпаведнага транспарту... Думаю, што правільна было б папулярызаваць веласіпед і на базах адпачынку, у тых жа аграсядзібах, выкарыстоўваць веласіпеды падчас турыстычных маршрутаў.

— У заходніх краінах паступова папулярнасць набіраюць электрамабілі. Калі яны прыйдуць да нас?

— Думаю, што перспектыва масавага пераходу на электрамабіль і замена бензінавага або дызельнага матора на электрычны рухавік — гэта далёкая будучыня для нас. Чаму? Па-першае, масавы пераход — гэта энергія. Трэба яе аднекуль браць, а стварэнне новых электрычных магутнасцяў — гэта таксама няпроста. Па-другое, для выкарыстання электрамабіляў патрабуецца стварэнне адпаведнай інфраструктуры — электрычных «заправак». Па-трэцяе, хуткасць зарадкі. Заправіць звычайны аўтамабіль можна даволі хутка — для гэтага патрабуецца 5-10 хвілін. Зарадка электрамабіля па сённяшніх тэхнічных характарыстыках займае мінімум 25-30 хвілін. Гэта можа прывесці да заторaў, чэргаў на запраўках.

Яшчэ адзін момант — надзейнасць і даўгавечнасць акумулятарных батарэй. Такая праблема яшчэ не вырашана, нягледзячы на тое, што сусветныя кампаніі выдаткоўваюць на гэта велізарныя сродкі.

Заўважу, што праграмай развіцця аўтамабілебудавання ў ЗША прадугледжана, што да 2020 года рынак электрамабіляў на агульным рынку аўтамабіляў складзе каля 1%. І гэта ў ЗША, дзе электрамабілі распаўсюджаны ўжо сёння. Таму нам рабіць стаўку на такія машыны пакуль рана.

Гутарыла Надзея ЮШКЕВІЧ

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению Вилейского районного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

ЗДАНИЯ КОНТОРЫ ОБЩЕПИТА,

инвентарный номер 631/С-62294, общ. пл. 71,9 кв.м, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская область, г. Вилейка, ул. Шубина.

Начальная цена с НДС – 61 000 000 бел. руб.
Площадь земельного участка **0,1378 га** (предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания конторы общепита).
Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».
Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 23.07.2014 г.
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.
Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Аукцион состоится **23.09.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.09.2014 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.**

Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА:

№ лота	Наименование имущества	Место нахождения имущества	Собственник	Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС)	Задаток 10%, рублей (без учета НДС)	Сумма шага аукциона, 5%	Реквизиты для оплаты задатка
1	Дебиторская задолженность Осипова Игоря Дмитриевича, уценка 10%	г. Гомель, ул. Победы, д. 8, кв. 1	КПУП «Гомель-реставрация»	850 952 669	85 095 267	42 547 633	р/с 3012407390019 в ОАО «Банк Москва-Минск», код 272, УНП 400084792

Организатор торгов – частное предприятие «Трастсистем».
Задаток перечисляется **до 10.10.2014 г.**
Условия продажи – без условий.
С лотом можно ознакомиться с 10.00 по 17.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20 холл второго этажа Экономического суда Гомельской области, по предварительному согласованию по тел. 80296727136.
После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.
В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.
Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.
Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением:
для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.
Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 10.10.2014 года** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20, холл второго этажа Экономического суда Гомельской области, по предварительному согласованию по тел. 80296727136.
Дата, время, место проведения открытого аукциона: **13.10.2014 года в 14.00** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20, холл второго этажа Экономического суда Гомельской области.
По вопросам участия в аукционе обращаться по телефону: 8 029 672 71 36.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

11 ВЕРАСНЯ 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 17 (15752)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Кацярына ІВАНЧЫКАВА:

«ЗАПРАГРАМУЙ СЯБЕ НА ПОСПЕХ!»

Гурт IOWA з'явіўся ў 2009 годзе ў Магілёве. Але «другім домам» для творчага калектыву стаў Санкт-Пецярбург, дзе маладыя людзі аселі з 2010 года і куды цяпер вяртаюцца кожны раз з гастроляў. Стыль IOWA — гэта кранальныя песні, якія расказваюць шчырыя гісторыі пра каханне, адзіноту, пошук саміх сябе. Плюс... самаіронія. У 2012-м каманда стала «Адкрыццём года» на Нацыянальнай музычнай прэміі Беларусі і прадстаўляла Расію на «Новай хвалі», дзе атрымала пахвалу ад самой Нэлі Фуртады. Як з'яўляюцца песні, якія становяцца хітамі, што сніцца па начах салістцы гурта і ці магчыма запраграмаваць поспех, мы спыталі ў «голасу» IOWA — Каці Іванчыкавай.

— Якім быў для вас пераезд у горад на Няве?

— Было складана, але вельмі хацелася ў ім застацца! Мы працавалі на свечкавым заводзе, дзе распісвалі свечкі, слухаючы па радыё ў цэху нашы першыя песні. Я працавала таксама ў краме падарункаў «Сваімі рукамі». Там плацілі капейкі, аднак кожную раніцу я бегла па Фантанцы, натхняючыся краявідамі і музыкай у плэеры. Паралельна мы падавалі заяўкі на ўдзел у розных конкурсах і аднойчы ў адным з іх выйгралі запіс песні, з якой і пачалася гісторыя групы IOWA ў Піцеры!

— Раскажыце, у чым адметнасць гэтага горада асабіста для вас?

— Мне падабаецца, што Піцер пастаянна нешта прыдумляе. Тут увесь час праходзяць розныя выставы, майстар-класы. У любой кавярні можна сустрэць падобраму звар'яцелых творчых людзей.

— Сумуеце па родных мясцінах, дзе нарадзіліся і рабілі свае першыя крокі ў музыцы?

— Я бачу свой дом у снах кожны дзень...

...Усяго некалькі гадоў мінула з моманту нараджэння музычнага калектыву, а сёння гурт адзін з самых вядомых і папулярных. IOWA пастаянна радуе прыхільнікаў новымі песнямі і цікавымі свежымі кліпамі. Кампазіцыі «Мама, калі я побач з ім» альбо «Шукаю мужа» — гэта хіты, якія можна пачуць па радыё, сінгл «Простая песня» — саўндтрэк да серыяла «Фізрук», «Усміхайся» гучыць у «Салодкім жыцці»...

— «Нашы песні — гэта адлюстраванне нас саміх...», — зазначылі вы ў адным з інтэрв'ю. У якім настроі і пры якіх абставінах узнікае жаданне пісаць?

— Часам тэксты песень «падаюць» на мяне, варта толькі пачуць гучанне Лёнінай гітары (Леанід Цярэшчанка — гітарыст гурта IOWA. — **Аўт.**). А іншыя з'яўляюцца метадам «выношвання», калі гляджу нейкі фільм альбо слухаю музыку. Напрыклад, на стварэнне песні «Шукаю мужа» мяне натхніў фільм «Любоў і галубы» і канцэрты Amy Winehouse.

— Дзе назапашвалі музычны вопыт да пераезду ў Піцер?

— Перш за ўсё ў розных музычных і тэлевізійных праектах. У Магілёве маім любімым месцам была хатняя студыя знаёмага аранжыроўшчыка, дзе збіраліся многія музыканты. Там мяне жартаўліва пачалі называць Аёва.

— Калі робіш музыку сваёй прафесіяй, як змяняецца жыццё?

— Яшчэ з трохгадовага ўзросту я ведала, што хачу быць спявачкай, і заўсёды праграмавала сябе на такі сцэнарый жыцця. Не ведаю, ці можа музыка быць галоўным жыццёвым інтарэсам, калі не прыносіць грошай, але абсалютна перакананa, што чалавек павінен займацца толькі тым, ад чаго атрымлівае задавальненне.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Педсавет

БАЛЕМ ПРАВІЦЬ БАЛ?

Сістэму ацэньвання абітурыентаў на ЦТ могуць перагледзець

Міністр адукацыі і навукі Расіі Дзмітрый Ліванаў днямі моцна азадачыў педагагічную грамадскасць сваёй прапановай, не ўлічваць пры ацэнцы выпускных сачыненняў... пісьменнасць іх аўтараў. Маўляў, «адзнака скоўвае, чалавек баіцца дапусціць памылку, а таму піша не зусім так, як хацеў бы». Па яго словах, мэтай вяртання ў расійскія школы выпускнога сачынення з'яўляецца не праверка пісьменнасці, а праверка здольнасці чалавека мысліць і аргументаваць свае высновы, абапіраючыся на літаратурныя творы.

Як вядома, у Расіі сёлета пасля здачы Адзінага дзяржаўнага экзамену давялося паніжаць патрабаванні па ўзроўню ведаў па рускай мове і матэматыцы, каб не пазбавіць выпускнікоў атэстатаў. Аднак калі кіраўнік адукацыйнай галіны не лічыць пісьменнасць абавязковым атрыбутам чалавека з вышэйшай адукацыяй, гэта выглядае па меншай меры дзіўна.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

«Сэлфі» на памяць з рэктарам БДУ Сяргеем Абламейкам — яшчэ адна маленькая ўзнагарода для тых, каму пашчасціла сёлета стаць студэнтамі.

Нефармальная адукацыя

ПТУШКА Ў ХАЦЕ — РАЙ У ДУШЫ

У Маладзечанскай гімназіі арганізаваны ўнікальны арніталагічны музей

Рэдкае дзіця з задавальненнем будзе хадзіць у школу падчас летніх канікулаў. Але, апынуўшыся ў памяшканні музея «Свет птушак», размешчанага ў гімназіі №3 г. Маладзечна, мы пераканаліся ў адваротным: каля вальераў з дзікімі птушкамі можна бавіць гадзіну за гадзінай.

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Усе экспанаты музея збіралі самастойна.

АД ГУРТКА — ДА МУЗЕЯ

Сустракае нас кіраўнік музея Дзмітрый ХАЛАДЗІНСКІ. Ён адразу папярэджвае: «Па адукацыі я юрыст, усё жыццё працаваў у міліцыі, а цяпер ужо на пенсіі». Гісторыя з'яўлення арніталагічнага музея па-свойму простая, але цікавая. Сам Дзмітрый Дзмітрыевіч ураджэнец Мінска, які пераехаў жыць у Маладзечна. Тут, у 3-й гімназіі (на той час — 3-й школе), адвучыліся абодва яго сыны. А калі Дзмітрый Дзмітрыевіч пайшоў на пенсію, былая дырэктар школы падкінула яму цікавую ідэю. «Людміла Уладзіміраўна ведала пра маё захапленне птушкамі і прапанавала стаць кіраўніком школьнага гуртка, — распавядае суразмоўца. — Вядома, я пагадзіўся, дый дзецям задумка спадабалася адразу. Прынёс некалькі клетак з дому, са старых шафаў зрабілі палічкі — і паступова кабінет «напоўніўся».

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
11 09 2014 г.

БАЛЕМ ПРАВІЦЬ БАЛ?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«З жыцця мікраарганізмаў»

У Беларусі год таму таксама гучалі прапановы ўвесці залікі па дзяржаўных мовах на той падставе, што гэтыя дысцыпліны — няпрофільныя для большасці спецыяльнасцяў, і для інжынера больш важнае веданне фізікі і матэматыкі, чым рускай ці беларускай мовы. І хоць мінімальны парог на ЦТ — самы нізкі менавіта на гэтых дзвюх дысцыплінах (ён складае ўсяго 10 балаў), для многіх абітурыентаў пераадолець яго ўсё роўна аказалася складана. Дастаткова вялікая колькасць тых, хто сёлета паступаў у рамках дадатковага набору, «завалілі» ЦТ менавіта па дзяржаўнай мове.

Яшчэ адна з прапаноў, якая, на

Мэта беларускага ЦТ — ацаніць адрозненні ва ўзроўні падрыхтоўкі абітурыентаў, параўнаць індывідуальныя вынікі з вынікамі іншых удзельнікаў і вызначыць адносную пазіцыю ў групе тых, хто трымае іспыт.

шчасце, не знайшла падтрымкі, датычылася намеру аб'яднаць у адным тэсце некалькі дысцыплін: размова ішла пра спалучэнне ў адным тэсце рускай і беларускай мовы; гісторыі Беларусі і грамадазнаўства; фізікі і матэматыкі; хіміі і біялогіі.

Сёлета Дзяржкамісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў зноў падкінула тэму для разважанняў. Маўляў, бацькам не зразумела, чаму іх дзіця атрымлівае ў школе «васьмёркі» па прадмеце, а на тэсціраванні набірае ўсяго 30 балаў. Значыць, трэба перагледзець сістэму падліку балаў удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання, каб можна было супастаўляць яе з сістэмай выстаўлення адзнак у школе. Усе зразумелі гэта як вяртанне да дзесяцібальнага ацэньвання вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання. І інтэрнэт «выбухнуў»...

Прывядзём толькі некалькі з выказванняў на форумах:

«Стабальная сістэма была ўведзена для дэталёвай дыферэнцыяцыі, гэта значыць, каб было менш людзей, якія набралі аднолькавую колькасць балаў па ўсіх трох ЦТ. І рэйтынгавыя каэфіцыенты ў залежнасці ад складанасці задання таксама скіраваны менавіта на гэта. А калі зараз уводзіць дзесяцібальную сістэму на ЦТ, то саму структуру тэстаў давядзецца кардынальна змяняць. Дык што, пачынаем усё з самага пачатку?»

«Цікавая матывацыя: «Ідучы насустрач пажаданням грамадскасці і выключна дзеля клопату пра някемлівых бацькоў бедных абітурыентаў». Натуральна, адзнака ў атэстаце (па розных прычынах) часта неаб'ектыўна адлюстроўвае ўзровень падрыхтоўкі вучня па гэтым прадмеце. Але што складанага ў тым, каб супаставіць 100 балаў ЦТ са школьнай «дзясяткай»? 80 балаў — «васьмёрка», 47 балаў — 4,7. Проста з такім цалкам лагічным суадносінам цяперашнія прахадныя 5 балаў ЦТ пры пераводзе ў школьны эквівалент ператвараюцца нават не ў «адзінку» (прычым па 10-бальнай шкале), а ўвогуле ў нешта з жыцця мікраарганізмаў — 0,5».

Хто вышэй ростам?

Нагадаем, што ў Беларусі, у адрозненне ад той жа Расіі (дзе даволі доўгі час спрабавалі пераводзіць вынікі Адзінага дзяржаўнага экзамену ў «дзесяцібалку», але ўрэшце адмовіліся ад гэтай ідэі), даўно перайшлі пры залічэнні ў ВНУ на 100-бальную рэйтынгавую сістэму і забыліся на паўпрахадныя балы.

Мэта беларускага ЦТ — ацаніць адрозненні ва ўзроўні падрыхтоўкі абітурыентаў, параўнаць індывідуальныя вынікі з вынікамі іншых удзельнікаў і вызначыць адносную пазіцыю ў групе тых, хто трымае іспыт. Вынікі такіх экзаменаў дазваляюць вызначыць рэйтынг кожнага абітурыента ў адпаведнасці з узроўнем яго падрыхтоўкі.

Калі колькасць прэтэндэнтаў значна перавышае колькасць вакантных месцаў у ВНУ і ССНУ, то толькі такі падыход і дазваляе найбольш справядліва адбіраць абітурыентаў.

Для ацэнкі вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў выкарыстоўвае працэнтную шкалу размеркавання балаў. Улічваецца не толькі колькасць правільна выкананых заданняў, але і іх адносная складанасць. Складанасць кожнага задання, ці яго вагавы каэфіцыент, вызначаецца статыстычна і залежыць ад колькасці ўдзельнікаў, якія выканалі яго правільна. Значыць, чым менш абітурыентаў справіліся з канкрэтным заданнем, тым вышэйшы яго вагавы каэфіцыент складанасці і тым большая колькасць балаў налічваецца ўдзельніку іспыту за правільнае выкананне задання. Гэта дае магчымасць добра дыферэнцыяваць як найбольш падрыхтаваную частку абітурыентаў, так і менш паспяховую.

Зноў паўпрахадныя балы?

Рэпетытар Яўген ЛІВЯНТ лічыць няўдалым намер Міністэрства адукацыі змяніць на ЦТ сістэму падліку балаў:

— Нельга крыўдзіцца на люстэрка. Якасць школьнай адукацыі не вытрымлівае ніякай крытыкі. І гэта трэба прызнаць і заняцца школай, вучэбнымі праграмамі, падрыхтоўкай педагогаў, а не спрабаваць завуаляваць правал абітурыентаў на цэнтралізаваным тэсціраванні. Я працую са старшакласнікамі і бачу, як яны змагаюцца за кожную дзясятую долю бала ў сваім школьным атэстаце, імкнуцца падцягнуць кожны прадмет, бо пры пераводзе ў 100-бальную шкалу гэтыя «дзясятыя» могуць вырашыць іх лёс. Для мяне як рэпетытара, безумоўна, было б лепш, каб старшакласнікі сканцэнтраваліся толькі на маім прадмеце. Але для школы важна, каб дзеці з павагай ставіліся да вывучэння ўсіх дысцыплін. А яны рабіць гэтага не будуць, калі зразумеюць новыя «правілы акруглення». Не будуць так адказна ставіцца да ўрокаў, як гэта ад-

Складанасць кожнага задання, ці яго вагавы каэфіцыент, вызначаецца статыстычна і залежыць ад колькасці ўдзельнікаў, якія выканалі яго правільна.

бываецца сёння. Напрыклад, сярэдні бал атэстата ў аднаго абітурыента 8,51, а ў другога — 8,49. Абодвум паставяць «васьмёрку» або «дзявятку» ці аднаму паставяць «дзявятку», а другому — «васьмёрку»? Як гэта будзе выглядаць на практыцы?

У пачатку 2000-х гадоў 100-бальная шкала ЦТ таксама пераводзілася ў 10-бальную і пераглядалася кожны год. Напрыклад, у 2005 годзе абітурыенты, якія набралі па матэматыцы ад 66 да 81 бала, атрымлівалі «7», а абітурыенты, якія набралі ад 82 да 92, атрымлівалі «8». Па фізіцы «сямёрка» выстаўлялася абітурыентам з сумай балаў ад 66 да 75, а «васьмёрка» — ад 76 да 87. Пытанняў было шмат. Яны і цяпер будуць. Тым больш што зноў з'явіцца паўпрахадны бал. Пры пераходзе з 400-бальнай сумы на 40-бальную рэзка ўзрасце верагоднасць супадзення балаў у прэтэндэнтаў на адну і тую ж спецыяльнасць.

Лічу, што пераход ад 100-бальнай шкалы да 10-бальнай падтрыманы грамадскасцю не будзе. Усе прызвычаіліся, што, скажам, для гарантаванага паступлення на многія спецыяльнасці ў БДУ трэба мець не менш як 300 балаў. І раптам гэты арыенцір змяняецца...

ЛЕПШЫЯ З ЛЕПШЫХ

Максімальны вынік (100 балаў) быў атрыманы на ЦТ у 122 выпадках. Сярод стабальнікаў 38 чалавек закончылі сярэднюю школу, 42 — гімназіі і 26 — ліцэі. Таксама 100 балаў атрымаў на ЦТ адзін выпускнік сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы і 15 выпускнікоў папярэдніх гадоў.

12 устаноў адукацыі, выпускнікі якіх дасягнулі 100-бальнага выніку, размешчаны ў сельскіх населеных пунктах.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:

Сёлета нулявыя вынікі на ЦТ былі атрыманыя ў 213 выпадках. Як і ў папярэднія гады, большасць з іх прыпала на матэматыку (132) і фізіку (43).

Не пераадолелі ніжні парог тэставага бала, неабходны для паступлення ў ВНУ ў асноўную хвалю, 40,7 тысячы чалавек, або 38% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў тэсціравання. У тым ліку 2,6 тысячы абітурыентаў — адначасова па трох прадметах, 12,2 тысячы — па двух прадметах і 24,5 тысячы — па адным прадмеце. Па фізіцы не пераадолелі ўстаноўлены парог 41,2% удзельнікаў экзамену, а па матэматыцы — 40,6%. У выніку дадатковага набору студэнтамі сталі 195 чалавек, якія «завалілі» ЦТ па двух прадметах, і 12 чалавек, якія «завалілі» ЦТ адразу па трох прадметах.

Угадаць ці знайсці адказ?

Яшчэ адна прапанова, выказаная членамі дзяржкамісіі, — правесці рэвізію структуры і зместу тэставых заданняў — для таго, каб зменшыць верагоднасць угадвання правільных адказаў. Прасцей кажучы, зменшыць колькасць заданняў у частцы А, дзе абітурыентам прапануюцца варыянты адказаў.

Зараз па ўсіх прадметах, за выключэннем матэматыкі і фізікі, нашы тэсты змяшчаюць 80 працэнтаў заданняў з варыянтамі адказаў (частка А) і 20 працэнтаў заданняў без выбару адказаў (частка В). На ЦТ па матэматыцы і фізіцы суадносіны заданняў частак А і В складаюць адпаведна 60 і 40 працэнтаў.

НА ВЯРШЫНІ РЭЙТЫНГУ

Па звестках Нацыянальнага інстытута адукацыі, у ТОП-10 устаноў адукацыі, выпускнікі якіх прадэманстравалі на ЦТ самыя высокія вынікі, увайшлі:

- Ліцэй БДУ
- Мінскі абласны ліцэй
- Ліцэй №2, г. Мінск
- Ліцэй №1, г. Ліда
- Гімназія №1, г. Брэст
- Ліцэй №1 імя А.С. Пушкіна, г. Брэст
- Ліцэй Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, г. Магілёў
- Магілёўскі дзяржаўны абласны ліцэй № 3
- Гомельскі абласны ліцэй
- Мазырскі абласны ліцэй.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў тлумачаць, што існуюць пэўныя законы пабудовы тэста, згодна з якімі ўзровень заданняў павінен узрастаць: абітурыент пры выкананні тэста рухаецца ад простых да больш складаных заданняў. Заданні часткі А, дзе прапануюцца варыянты адказаў, правяраюць або ўменне лагічна разважаць, або ўменне аналізаваць і хутка рабіць выснову, або выбіраць правільны адказ з падобных. Правільна сфармуляванае заданне патрабуе ўдумлівага аналізу і супастаўлення магчымых варыянтаў рашэння. Праўда, ёсць пытанне: а колькі ж павінна быць дыстрактараў (праўдападобных варыянтаў адказаў) у адным заданні? Закрытыя заданні вобласці А могуць мець 4-5 варыянтаў адказаў — прапаноўваць большую колькасць варыянтаў немэтазгодна, паколькі гэта вымагае больш часу і ўскладняе выкананне тэста.

А для таго, каб тэст мог больш дакладна вызначыць рэйтынг удзельнікаў тэсціравання, існуе вобласць В, дзе няма адказаў на прапанаваныя пытанні і задачы. Заданні вобласці В у большай ступені дазваляюць дыферэнцыяваць абітурыентаў з больш глыбокай падрыхтоўкай. Але разам з тым яны цяжка паддаюцца аўтаматызацыі пры апрацоўцы бланкаў адказаў. Калі па матэматыцы і фізіцы адказам з'яўляецца лічба, то па гісторыі ці грамадазнаўстве трэба ў бланк адказаў упісаць слова ці словазлучэнне. А калі ёсць некалькі варыянтаў правільнага адказу? Ці, напрыклад, абітурыент запісаў гэтае слова з памылкай? Як камп'ютарнай праграме іх залічыць?

Калі паглядзець на практыку іншых краін, то там заданні з варыянтамі адказаў выкарыстоўваюцца паўсюдна, дзе экзамены праводзяцца ў тэставай форме. Многія краіны, каб максімальна аўтаматызаваць працэс апрацоўкі тэставых матэрыялаў, прапануюць на экзаменах заданні толькі з выбарам варыянту адказаў.

Лонданская школа эканомікі і палітычных навук на ўступных іспытах па матэматыцы прапануе на працягу адной гадзіны выканаць 30 заданняў з некалькімі варыянтамі адказаў. Ва ўніверсітэтах Германіі TestAS вызначае здольнасці замежных абітурыентаў да навучання і ўключае 150 заданняў з выбарам адказу з чатырох прапанаваных варыянтаў.

Ва Украіне пры знешнім незалежным ацэньванні (аналаг нашага ЦТ) усе тэсты камбінаваныя: па большасці прадметаў 90% заданняў на выбар варыянтаў адказаў (частка А) і толькі 10% — адкрытага тыпу (частка В). Па рускай жа мове ва Украіне зусім адмовіліся ад часткі В пры 50 заданнях часткі А.

Школьная ацэнка — яшчэ не гарантыя

Сёлета з агульнай колькасці абітурыентаў, залічаных па дадатковым наборы, 84% не мелі б права паступаць у ВНУ, калі б Міністэрства адукацыі не знізіла парог для тэставых балаў, пачынаючы з якога адзнакі прызнаюцца здавальняючымі. Застаецца спадзявацца, што яны ўсё ж такі змогуць адаптавацца да патрабаванняў вышэйшай школы. Але ёсць асцярога, што ўжо першая экзаменацыйная сесія можа стаць для іх «лебядзінай песняй».

Што тычыцца школьных атэстатаў, то школьныя адзнакі карэлююць з паспяховасцю студэнтаў у меншай ступені. Яно і зразумела, бо школьны бал — гэта ацэнка настаўнікам ведаў школьніка, якая пры гэтым выконвае і ролю стымулу ў навучанні, таму часта яна завышаецца. Школьны настаўнік не толькі ацэньвае кожнага вучня, але і ўлічвае мінулыя яго заслугі, індывідуальныя якасці. Абітурыент мог быць, умоўна кажучы, «зоркай» сярод сваіх аднакласнікаў, але пры паступленні ў ВНУ страціць свае лідарскія пазіцыі. Некаторыя выдатнікі даведваюцца пра сваю неканкурэнтаздольнасць толькі падчас уступных выпрабаванняў. Але калі такі «выдатнік», які мае ў атэстаце «9» ці «10» балаў, атрымае і на ЦТ 9 ці 10 балаў па 10-бальнай шкале — няўжо гэта будзе справядліва?

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трыумф лепшых

ПЕРШАЕ МЕСЦА ЎЗЯЛІ ШЧЫРАСЦЮ

Званне лепшай пярвічнай арганізацыі ў краіне сярод актывістаў БРСМ сёлета заваявалі маладыя людзі з Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Фінальныя спаборніцтвы праходзілі ў Жлобіне, на тэрыторыі Беларускага металургічнага завода.

Сем камандаў з усіх абласцей і Мінска змагаліся за перамогу. Брэстчыну прадстаўляла ААТ «Птушкафабрыка «Дружба», Гродзенскую вобласць — каманда прафесійна-тэхнічнага каледжа бытавога абслугоўвання насельніцтва. Ад Гомельшчыны былі навучэнцы сярэдняй школы №2 з Рагачова, гонар Міншчыны адстойвалі вайскоўцы в/ч 06752 50-й авіяцыйнай базы, а Магілёўшчыны — каманда гімназіі №1 з Горак. Навучэнцы сталічнага каледжа прадпрымальніцтва прадстаўлялі Мінск.

Беларускі металургічны завод у якасці пляцоўкі для спаборніцтваў выбралі невыпадкова, бо менавіта маладыя жлобінскія металургі былі лепшымі летась. Сёлета БРСМаўцам розных узростаў прыйшлося абараняць свае праекты, а таксама ўдзельнічаць у конкурсах «Візітная картка» і «Я — лідар!». Апошні конкурс і стаў лёсавызначальным для ветэрынараў з Віцебска. Апошнія тры з паловай гады іх пярвічную арганізацыю ўзначальвае малады вучоны, аспірант кафедры клінічнай дыягностыкі Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны Арцём Ігнаценка. Ён кажа, што і журы, і аўдыторыю яны пакарылі, хутчэй за ўсё, шчырасцю:

— Самым складаным быў конкурс «Я — лідар!». У нас атрымалася перамагчы ўсіх і прымусіць залу практычна рыдаць. Усе жанчыны расчуліліся і плакалі падчас майго выступлення. Я сам родам з Рагачова, а гэта зусім побач са Жлобінам. Мае бацькі прыехалі на гэтыя спаборніцтвы, каб падтрымаць мяне і каманду. Я паклікаў іх на сцэну, а далей атрымалася імправізацыя, якая ўсім спадабалася. Я гаварыў пра сваіх бацькоў — як многа яны мне далі ў жыцці. Акрамя таго, у складзе нашай каманды была наша аматарская студыя эстраднай песні «Канстанта» і танцавальны калектыў, таму разам атрымлівалася заводзіць залу.

Дарэчы, культмасавая работа — далёка не ўсё, чым вылучаюцца будучыя ветэрынары з Віцебска. Хаця і тут ёсць чым пахваліцца. Сёння пярвічная арганізацыя БРСМ Віцебскай ветэрынарнай акадэміі — арганізатар міжнароднага фестывалю сучаснага танца «Зрабі крок наперад!» сярод студэнтаў, які штогод збірае больш за 350 удзельнікаў з розных краін свету.

Да таго ж маладыя людзі актыўна ўдзельнічаюць у розных міжнародных агульнаадукацыйных і навуковых форумах. Тут лепшы добраахвотны атрад краіны, члены якога заўсёды гатовыя прыйсці на дапамогу. На працягу трох апошніх гадоў пярвічная арганізацыя акадэміі — адзін з лепшых штабаў працоўных спраў у Віцебску і вобласці. Штогод тут фарміруецца каля 40 атрадаў, у якіх працуюць больш за 1100 маладых людзей. Увогуле ж у пярвічнай арганізацыі БРСМ ветакадэміі — 1183 студэнты.

Амбіцыйны і мэтанакіраваны сакратар «пярвічкі» Віцебскай ветэрынарнай акадэміі Арцём Ігнаценка сцвярджае, што актыўная грамадская работа не перашкаджае яго навуковай дзейнасці:

— Наадварот, адно другому дапамагае. Хаця часу ў сутках не хапае. Тады нешта з сябрамі і па начах робім. З першых дзён вырашыў, што мы павінны ісці да найвышэйшай узнагароды БРСМ — ганаровай граматы і залатога значка. Гэта, спадзяюся, у нас наперадзе.

Каштоўныя прызы ў якасці ўзнагарод таксама парадавалі ўдзельнікаў рэспубліканскага фестывалю. За першае месца — планшэт ASUS Nexus 7. За другое і трэцяе месцы — планшэт ASUS Fonepad. Іх атрымалі пярвічныя арганізацыі БРСМ гімназіі №1 з Горак і Мінскага каледжа прадпрымальніцтва.

Сакратар ЦК БРСМ Дзмітрый Варанюк адзначыў, што праект накіраваны на ўмацаванне галоўнага звяна Саюза моладзі — пярвічнай арганізацыі, якая з'яўляецца асновай БРСМ.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Новыя старты

БРЭНДавыя справы БРСМ

Маладзёжная палітыка сумнай не бывае

Ужо традыцыйна напярэдадні дня нараджэння самай масавай маладзёжнай арганізацыі краіны каардынатары падводзяць вынікі і плануюць будучыя мерапрыемствы. Як адзначыў першы сакратар Цэнтральнага камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Ігар БУЗОЎСКІ, «нашы праекты не заканчваюцца, а лагічна ператвараюцца ў іншыя. Многія напрамкі дзейнасці сталі брэндавымі. Гэта датычыцца і студатрадаўскага, і валанцёрскага руху, комплексу патрыятычных мерапрыемстваў, падтрымкі таленавітай і адоранай моладзі. За кожным з іх стаяць людзі і вялікая праца».

Каардынатар студатрадаўскага руху Андрэй БЕЛЯКОЎ заўважыў, што хоць сёлета ўладкавалі на працу каля 47 тысяч маладых людзей, у гэтай сферы хапае праблем: ёсць выпадкі, калі студэнтаў у прамым сэнсе эксплуатуюць. БРСМ паставіла перад сабой задачу знайсці парытэт паміж добрымі ўмовамі працы і годным заробкам. Многія хлопцы могуць пахваліцца вынікамі сваёй працы: так, студэнт чацвёртага курса ГрДУ ім. Янкі Купалы і па сумяшчальніцтве камандзір беларуска-расійскага студатрада імя І. Лебедзева Андрэй СКАЛОТА праводзіць лета ў студатрадзе ўжо шосты раз. Сёлета яго брыгада рыхтавала Заслаўе да Дня пісьменства. Заробак «байцоў» атрымаўся неблагі: па 9-11 мільёнаў за месяц. Цяпер у арганізацыі працуюць над тым, каб кожны ахвотны мог далучыцца да студатрада. Дарэчы, пашчыраваць можна не толькі ўлетку, бо атрады ствараюцца на працягу ўсяго года.

Другі важны напрамак дзейнасці арганізацыі — выхаванне патрыятызму ў моладзі. Так ці інакш, але патрыятычнай тэматыкай прасякнуты ўсе праекты БРСМ. Напрыклад, імёнамі герояў Перамогі названы студатрады. Ужо запушчаны праект «70 гадоў міру», у рамках якога арганізатары прапануюць зрабіць фотаздымак са сваякамі, якія прайшлі вайну. Пасля ўсе фота будуць сабраны ў адзін фільм-прэзентацыю. Каардынатар праектнай дзейнасці БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК распавёў, што сёння яны сур'ёзна займаюцца рэалізацыяй вялікай задумкі, а менавіта — стварэннем патрыятычных класаў у школах. Пакуль праект распрацоўваецца сумесна з Мінадукацыі.

Вялікі крок наперад — супрацоўніцтва з еўрапейскімі калегамі ў галіне абмену вопытам і валанцёрамі. Сёлета БРСМ атрымала акрэдытацыю ў Еўрапейскай валанцёрскай службе. Цяпер удзельнікі праекта «Добрае сэрца» змогуць прапанаваць сваю дапамогу не толькі на прасторах СНД. Так, разам з моладдзю Германіі і Польшчы беларускія добраахвотнікі добраўпарадкавалі брацкія магілы. Акрамя таго, у гэтым годзе БРСМ далучылася да маладзёжнага савета Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, што дае магчымасць пашыраць геаграфію абменаў.

Рэспубліканскі конкурс «100 ідэй для Беларусі» — стартавая пляцоўка для маладых вынаходнікаў і навукоўцаў. Летась пераможца конкурсу Павел БАЦЫЛЕЎ прадставіў праект «Мабільная праграма X10». А сёлета хлопец стварыў падобную прыкладную праграму для БРСМ: пачытаць апошнія навіны арганізацыі цяпер можна на смартфоне. Паслуга працуе з 5 верасня. Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН адзначыў, што пераможцы праекта «100 ідэй для Беларусі» аўтаматычна трапляюць на рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў, дзе ёсць асобная намінацыя для маладых талентаў. Гэты «скачок» — добрая магчымасць для атрымання грантаў на распрацоўку значнага праекта.

Каардынатар дзейнасці БРСМ у інтэрнэт-прасторы Алеся ВІННІК заўважыла, што арганізацыя ўлічвае новыя тэндэнцыі: зараз навіны БРСМ можна пачытаць ва ўсіх сацыяльных сетках. Акрамя таго, ужо год працуе адмысловы партал, дзе можна пачытаць блогі аўтараў з многіх куткоў краіны. БРСМ падрыхтавала асаблівыя падарункі для сваіх прыхільнікаў — нядаўна было запушчана «Душэўнае радыё», праграма якога разлічана не толькі на маладых людзей, але і на іх бацькоў. Таксама ў хуткім часе членаў БРСМ чакае новы білет у выглядзе банкаўскай карткі.

Дасягненні — гэта цудоўна, але надышоў час нарошчваць тэмпы: будучы год афіцыйна аб'яўлены Годам моладзі. Ужо распачаты масавы маладзёжны праект — адкрыты дыялог «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня». Арганізатары спадзяюцца знайсці новыя ідэі і падтрымаць цікавыя прапановы па рэалізацыі маладзёжнай палітыкі ў краіне.

Кацярына РАДЗЮК.

Крок да прафесіі

«БЕЛАЯ РУСЬ» ПАШЫРАЕ ТВОРЧЫЯ ГАРЫЗОНТЫ

Сёлета на конкурс маладых журналістаў «Залатое пяро Белай Русі», які праводзіцца трэці раз, было пададзена каля 400 аўтарскіх работ, папярэдне адабраных на гарадскіх і абласных узроўнях. Кіраўніцтва рэспубліканскай грамадскай арганізацыі ўпершыню праехала па рэгіёнах, каб асабіста павіншаваць яго пераможцаў.

Як адзначыў намеснік старшыні «Белай Русі» Аляксандр Шацько, які наведаў Магілёў, гэты абласны цэнтр стаў адзіным, дзе ўшанаванне і пераможцаў, і ўдзельнікаў прайшло ў такім маштабе і ва ўрачыстай абстаноўцы. Ён нагадаў, што галоўная задача конкурсу «Залатое пяро Белай Русі» — падняць узровень прафесіяналізму маладых журналістаў на больш высокую ступень, зрабіць усё магчымае, каб іх запал і інтарэс да прафесіі не згаслі. Аляксандр Шацько адзначыў, што ў Беларусі вялікая колькасць таленавітай моладзі. Але яна, па вялікім рахунку, асвятляе толькі ўнутраныя лакальныя мерапрыемствы, піша для школьных і студэнцкіх газет. Конкурс дае магчымасць зрабіць крок на новую прафесійную прыступку.

У катэгорыі «З «Белай Руссю» мы — адзіныя» абсалютным пераможцам стала студэнтка Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова Наталля Ціханоўская.

У будучыні «Белая Русь» плануе прыцягнуць у свае шэрагі як мага больш моладзі праз пашырэнне конкурснага складніка сваёй дзейнасці.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Круці педалі!

«НАМАТАЙ» САБЕ... ВЕЛАСІПЕД

Сёння ад сцен галоўнага корпуса БДПУ імя М. Танка стартуе маладзёжны праект «Будучыя педагогі — за здаровы лад жыцця». Яго ініцыятарамі выступіла кіраўніцтва галоўнай педагагічнай ВНУ краіны і веласіпедны брэнд AIST.

Старт праекта прымеркаваны да 100-годдзя БДПУ і Дня горада. Яго галоўная задума — далучэнне студэнтаў да актыўнага ладу жыцця і сучаснага, еўрапейскага, разумення велакультуры. Гарадскі веласіпед — гэта не толькі здорава і карысна, але і прыгожа, модна, а галоўнае, камфортна.

З рук рэктара БДПУ і прадстаўнікоў ААТ «Мотавела» студэнтам будзе перададзена 100 новых гарадскіх веласіпедаў. Менавіта на іх у суправаджэнні вядомых спартсменаў студэнты праедуць па запланаваным маршруце. Далей — болей: маладзёжны праект «Будучыя педагогі — за здаровы лад жыцця» паскорыць свой рух. Яго працягам стануць шматлікія акцыі, адна з якіх — «100 кіламетраў да 100-годдзя БДПУ». Кожную суботу на працягу двух месяцаў будучыя педагогі і навучэнцы педагагічных класаў 20-й сталічнай гімназіі будуць сустракацца на веладарожках Мінска. Да юбілею ўніверсітэта, які адзначаецца ў лістападзе, удзельнікам акцыі прапануюць праехаць на веласіпедзе 100 кіламетраў. А тыя з іх, якія адолеюць 200 кіламетраў, атрымаюць у падарунак веласіпед AIST ад рэктара БДПУ Аляксандра Жука. На ім можна будзе ездзіць ва ўніверсітэт на заняткі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДАВЕДКА

У 2012 годзе на веласіпедах AIST беларускія спартсмены ўстанавілі алімпійскі рэкорд і два нацыянальныя рэкорды на велатрэку на Алімпіядзе ў Лондане. AIST з'яўляецца тэхнічным партнёрам нацыянальнай каманды Беларусі па веласпорце. Сёлета веласіпедны брэнд AIST быў прызнаны «Народнай маркай Беларусі».

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
11 09 2014 г.

ПТУШКА Ў ХАЦЕ — РАЙ У ДУШЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прайшло некалькі гадоў, і гурток ператварыўся ў клуб, а пасля на месцы былога кабінета фізікі ў 2006 годзе з'явіўся паўнавартасны музей. Але гэта незвычайны для нашага ўяўлення музей, бо пры ім ёсць «жывы куток» з птушынымі экспанатамі. У вальерах жывуць канарэйкі, зелянушкі, папугаі і, вядома ж, некалькі відаў галубоў, у тым ліку ўнікальныя мінскія бярозавыя — прадстаўнікі адзінай беларускай пароды. Развядзеннем займаюцца гурткоўцы. Такім чынам, гэта яшчэ і цэнтр селекцыі па развядзенні і захаванні племянных галубоў. Можна сказаць, што «Свет птушак» — адзіная ў нашай краіне ўстанова падобнага профілю. Як адзначыў Дзмітрый Дзмітрыевіч, аналагаў яму няма і на постсавецкай прасторы. Сама экспазіцыя падзелена на тры раздзелы: аддзел гісторыі галубагадоўлі Беларусі, аддзел гісторыі канарагадоўлі і аддзел па гісторыі развядзення і ўтрымання дзікіх птушак у хатніх умовах.

Увагу адразу захапіў вялізны крумкач Карлуша — птушка прыгожая, і, як аказалася, разумная. У слоўнікавым запасе крумкача — 30 слоў.

Працы насамрэч хапае. У экспазіцыі музея — эксклюзіўныя фотаздымкі з птушыных выстаў, чучалы, клеткі, кубкі з міжнародных выстаў, калекцыі гнёздаў і птушыных яек...

Тут у музей заскочылі некалькі дзяўчат. «Усе мае, гурткоўцы, — з задавальненнем кажа Дзмітрый Дзмітрыевіч. — Пяцікласніцы пачалі наведваць заняткі па арніталогіі толькі сёлета, а ўжо робяць пэўныя поспехі».

Ужо чатыры навучэнцы Дзмітрыя Халадзінскага скончылі ветэрынарны тэхнікум, адзін — ветэрынарную акадэмію ў Віцебску. Былыя гурткоўцы так ці іначай звязваюць свой лёс з птушкамі: неаднойчы падчас нашай сустрэчы Дзмітрыя Дзмітрыевіча турбавалі званкі. «Вось бачыце, у аднаго на працы стаяць вальеры са снегірамі, патрэбна мая кансультацыя», — весела пераказвае змест размовы Дзмітрый Дзмітрыевіч.

ПТУШЫНАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ

Але і недасведчаным пакуль што пяцікласнікам ёсць чым заняцца. «Ведаеце іх распарадак дня? — усміхаецца Дзмітрый Дзмітрыевіч. — Заканчваюцца заняткі ў школе, пасля яны забягаюць да мяне дамоў паглядзець птушак і толькі тады ідуць дахаты».

Кальцаваннем птушак займаюцца ўсе гурткоўцы. Поспехі ў гэтым напрамку дасягнуты значныя. Самае ганаровае — гэта альбо калі намі закальцаваную птушку злавілі ў Еўропе, альбо калі мы ловім кальцаванага госця з Еўропы. Дзмітрый Халадзінскі і яго выхаванцы злавілі сініцу, якая кальцавалася ў Празе, і двух гракоў з Германіі. А чорнага дразда, закальцаванага ў Маладзечне, злавілі немцы. Па словах дырэктара музея, прыкладна пятнаццаць гадоў арніталагічны гурток аказвае дапамогу рэспубліканскаму цэнтру кальцавання птушак.

На заняткі ў клуб да Дзмітрыя Халадзінскага дзеці ходзяць з вялікай ахвотай.

Музей — гэта яшчэ і цудоўная эксперыментальная база, бо навуковая праца вядзецца тут няспынна. Пра гэта сведчаць і афармленыя ў стэнды вынікі работы «птушанёвае развіццё птушак» на прыкладзе галубоў. Гурткоўцы праводзілі цікавы эксперымент па атрыманні птушанят-гібрыдаў канарэйкі з дзікімі відамі птушак: чыжамі, канаплянкамі, зелянушкамі, аўсянкамі. Далучаюцца і настаўнікі біялогіі, для якіх ёсць выдатнае візуальнае суправаджэнне тэарэтычнаму матэрыялу. Традыцыйнымі сталі конкурсы на лепшую кармушку і шпакоўню. А яшчэ штогод музей удзельнічае ў правядзенні гарадской птушынай выставы, гурткоўцы выпускаюць галубоў на святах: вечарах выпускнікоў, днях ведаў, на Дзень Перамогі. І перыядычна ўдзельнічаюць у выстаўках дзікіх птушак...

«ХУТКАЯ ДАПАМОГА» ДЛЯ КРЫЛАТЫХ

Пра мясцовы музей ведае ўвесь горад, таму да Дзмітрыя Дзмітрыевіча пастаянна звяртаюцца з просьбай дапамагчы птушцы, якая трапіла ў бяду. Частымі гасцямі бываюць падранкі — падбітыя птушкі. Сёлета ўвогуле на буслоў быў «гарачы сезон» — ажно дзесяць птушак. «У аднаго крыло падбіта, іншы трохі хворы, птушанё вывалілася з гнязда — яго таксама да мяне, — кажа Дзмітрый Халадзінскі. — І ледзь не з крыўдай у голасе прамаўляюць — у вас жа «жывы куток». А пра тое, што буслу трэба як мінімум кілаграм мяса на дзень, а батонам і кашай яго не накорміш, ніхто і думаць не хоча». Харчаванне птушынага царства — клопат Дзмітрыя Дзмітрыевіча, на ўтрыманне «жывога кутка» даводзіцца выдаткоўваць шмат сродкаў. Але хіба гэта перашкода для сапраўднага аматара?

«Свет птушак» — адзіная ў нашай краіне ўстанова падобнага профілю. Як адзначыў Дзмітрый Дзмітрыевіч, аналагаў яму няма і на постсавецкай прасторы.

Пра мясцовы музей ведае ўвесь горад, таму да Дзмітрыя Дзмітрыевіча пастаянна звяртаюцца з просьбай дапамагчы птушцы, якая трапіла ў бяду. Частымі гасцямі бываюць падранкі — падбітыя птушкі.

«Калі бяру птушку ў «жывы куток» ці дамоў, то яна застаецца ў мяне да канца свайго жыцця. Па вопыце ведаю: пасля знаходжання ў няволі ёй будзе цяжка зноў адаптавацца да ўмоў дзікай прыроды. Многія, напрыклад, губляюць асцярожнасць. Вось таму ўсіх птушак узяць не магу, а падлячыць — калі ласка, звяртайцеся».

НЕ ХОБІ, А САПРАЎДНАЯ ЛЮБОЎ

Завяршыўшы экскурсію па музеі, мы адправіліся дамоў да Дзмітрыя Дзмітрыевіча, дзе нас чакаў сюрпрыз. «Я сябе без птушак не памятаю, — прызнаецца той. — У бацькі было шэсць братоў, і толькі адзін з іх не трымаў галубоў і іншых птушак. Нас нельга назваць знаўцамі птушак — хутчэй, аматарамі».

Дома ў Дзмітрыя Дзмітрыевіча створаны сапраўдны птушнік: цяпер зразумела, чаму вучні ходзяць сюды ледзь не штодня. Гусі, галубы, зелянушкі, канарэйкі... Увагу адразу захапіў вялізны крумкач Карлуша — птушка прыгожая, і, як аказалася, разумная. У слоўнікавым запасе крумкача — 30 слоў. Мы не надта верылі, пакуль не пачулі выразнае «Карлуша харошы!». Шок і захапленне ў адным «флаконе». «Насамрэч размаўляюць і крумкачы, і сарокі толькі калі браць птушку на хатняе выхаванне яшчэ птушанём, — дзеліцца вопытам Халадзінскі. — Я ведаў, што Карлуша пачне размаўляць — так і адбылося».

«Птушка ў хаце — рай у душы», — кажа кітайская прыказка. І прыклад Дзмітрыя Дзмітрыевіча Халадзінскага — таму пацвярджэнне.

Кацярына РАДЗЮК.
Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.
Мінск — Маладзечна — Мінск.

Карлуша харошы.

У сям'і турковак ужо з'явілася першае патомства ў няволі.

Будзем знаёмыя

ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ... ГЕНІЕМ?

«Не ведаю» — не для гэтага хлопца

Першае, што ўражвае ў гэтым юнаку, — іранічная ўсмешка і пачуццё гумару. Ён нават чымсьці нагадвае расійскага шоўмена Івана Урганта. І знешне падобны да яго, і па вострае слова ў кішэню не лезе. А яшчэ ён — тонкі псіхолаг, які вельмі добра адчувае свайго суразмоўцу. Часам здаецца, бачыць яго наскрозь. І гэта пры тым, што юнак ад нараджэння невідушчы.

Павел віртуозна іграе на баяне і марыць стаць дыджэем.

Павел Міхайлоў — адзін з лепшых сёлетніх выпускнікоў Шклоўскай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку. Ён на дастаткова высокім узроўні ведае камп'ютар, віртуозна іграе на баяне, дасканала валодае нямецкай мовай. Магчыма, такія маладыя людзі зараз не выключэнне, але ж Павел дасягнуў гэтых вынікаў пры адсутнасці зроку.

Маці працягвае мне цэлы стос ганаровых грамат і падзячных лістоў — за гады вучобы ў школе-інтэрнаце сын неаднаразова займаў прызавыя месцы. На вочы трапіла некалькі падзяк за перамогу ў гульнях «Самы разумны» і «Самы кемлівы», граматы са словамі ўдзячнасці ад кіраўніцтва ўстановы за выніковы ўдзел у трэцім этапе рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы, некалькі дыпломаў пераможцы другога і трэцяга этапаў рэспубліканскай алімпіяды па нямецкай мове. А ў пахвальным лісце, які ён атрымаў сёлета разам з атэстатам, адзначаюцца яго асаблівыя поспехі ў вывучэнні замежнай мовы і інфарматыкі.

Як толькі Павел пазнаёміўся з камп'ютарам, яго запаветнай марай стала вывучыцца на праграміста. Сярод вучняў ён лічыўся самым дасведчаным у гэтай галіне. Да яго звярталіся па дапамогу і таварышы па вучобе, і нават настаўнікі. Ён даваў кансультацыі і па тэлефоне. Пра новыя праграмы таксама даведваліся менавіта ад яго. Хлопец марыў паступаць у БДУ на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і, напэўна, стаў бы адным з лепшых студэнтаў універсітэта. Але чамусьці лічыцца, што гэтая прафесія не для невідушчых. Так што з марай давялося расстацца.

Затое як радаваліся настаўнікі Шклоўскай дзіцячай школы мастацтваў, калі Паша падаў дакументы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў! Настаўніца па музыцы Ала Янісава лічыць, што выбраць гэты шлях яго падштурхнула найвышэйшая адзнака па спецыяльнасці. Сёлета толькі ён ды яшчэ адзін вучань з усёй установы атрымалі дзясяткі.

Ала Янісава спадзяецца, што яму пашчасціць з выкладчыкамі. Сама яна спачатку скептычна паставілася да хлопца і яго магчымасцяў. Але праз нейкі час зразумела, што Павел надзвычай таленавіты — у яго абсалютная памяць і вельмі добры музыкальны слых.

Ва ўніверсітэце ацанілі не толькі выдатную музычную падрыхтоўку выпускніка Шклоўскай дзіцячай школы мастацтваў, але і яго добрыя веды па агульнаадукацыйных прадметах. Па рускай мове ён набраў падчас тэсціравання больш за 80 балаў, па гісторыі Беларусі — звыш 70. І гэта пры тым, што гісторыя была не самым «моцным» яго прадметам. Яго прага да ведаў вартая захаплення. «Аднойчы ён спытаўся ў мяне: навошта людзі прыдумалі слова «не ведаю»?» — усміхаецца маці Паўла.

У школе-інтэрнаце, дзе Павел знаходзіўся большую частку свайго жыцця, памятаюць, як у 7 гадоў ён з ходу асвоіў чытанне па Брайлю і «падсеў» на кнігі. Сёння ў крамах, бібліятэках, інтэрнэце літаратура — на любы густ: чытай — не хачу. У Паўла, на жаль, выбар абмежаваны. Ён можа чытаць толькі па Брайлю, а такіх кніг няшмат. У школьнай бібліятэцы ён, напэўна, перачытаў усё. І асабліва яго цікавілі энцыклапедыі. Тыфлапедагог Гульнара Міронава ўспамінае, што ён заўсёды ведаў адказ на любое пытанне. Аднакласнікі нават звалі яго геніем. Аднойчы на абласной алімпіядзе па матэматыцы незвычайны вучань здзівіў настаўнікаў схемай рашэння складанай задачы для сёмага класа. Ён так добра патлумачыў усё на прыкладзе ўзаемадзеяння двух хлопцаў, што эксперты былі ўражаны. Такі нестандартны метад рашэння яны пачулі ўпершыню.

Настаўніца нямецкай мовы Вольга Клюйко ўжо некалькі гадоў не працуе ў школе-інтэрнаце, але і сёння захапляецца здольнасцямі свайго вучня. Ён незвычайны ўжо тым, што адзіны на яе ўроках размаўляў выключна па-нямецку, прычым на розныя тэмы. Задаваў пытанні пра сутнасць жыцця, каханне, цікавіўся, як жыць, калі пачуцці не падзяляюць... Наогул, веды яго выходзілі далёка за рамкі школьнага навучання. Ён нават марыў стварыць праграму па вывучэнні нямецкай мовы праз інтэрнэт для тых, хто мае праблемы са зрокам.

Ён так добра патлумачыў задачу на прыкладзе ўзаемадзеяння двух хлопцаў, што эксперты былі ўражаны.

Аднойчы на ўваходзе ў школу, дзе праходзіла раённая алімпіяда па нямецкай мове, настаўніца Таццяна Чыкіза, якая суправаджала Пашу, забыла папярэдзіць, што ў дзвярэй зверху нізкі вушак. І вельмі перапалохалася, калі Павел схапіўся за лоб. Але ён хутка прыйшоў у сябе і супакоіў: «Не турбуйцеся, Таццяна Міхайлаўна, дагэтуль у мяне была каша ў галаве, а цяпер усё легла па палічках». Цікава, што ён сапраўды стаў пераможцам алімпіяды. Роўна праз год па дарозе на чарговую алімпіяду вучань з настаўніцай... паслізнуліся на лёдзе. Трэба было бачыць, як ляцелі кніжкі ў розныя бакі. Настаўніцы было не да смеху, а Павел толькі пажартаваў: «Гісторыя, здаецца, паўтараецца. Першае месца нам забяспечана». Усё спраўдзілася і на гэты раз.

Настаўнікі кажуць пра Паўла: вельмі таленавіты хлопец, але прынцыповы і з цвёрдым характарам. Ніколі не будзе займацца тым, што яму нецікава.

Знайсці агульную мову з Паўлам няпроста, ён не з тых, хто пойдзе з кожным на кантакт. Калі адчувае, што шчырасці няма і ў паміне, замыкаецца. Але на любімыя тэмы — пра камп'ютары ці электронную музыку — можа гутарыць доўга. З захапленнем слухае Армена Ван Бюрэна, вядомага сваімі кампазіцыямі ў стылі «транс», і марыць стаць такім жа вядомым дыджэем. Прызнаецца, што вельмі хацеў бы навучыцца рабіць рэміксы. Па жыцці ён аптыміст. «Жыву, ні на што не скарджуся», — агучвае сваю жыццёвую пазіцыю. І верыць, што анёл-ахоўнік ніколі яго не пакіне. А яшчэ ён марыць аб каханай дзяўчыне і моцнай сям'і. Вельмі хочацца, каб усе яго жаданні здзейсніліся.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.

Эх, каб яшчэ...

БЕЛАРУСКІЯ «РАЗВЕДЧЫКІ» Ў ФРАНЦУЗСКІМ ЛЕСЕ

Што рабілі? Спявалі «Купалінку» і гулялі ў «Ручаёк»!

Сёлета каля 180 беларускіх скаўтаў наведалі «Еўраджэм» — агульнаеўрапейскі скаўцкі лагер, які ладзіўся непадалёк ад нармандскага горада Лізьё, што ў Францыі. Пра ўражанні ад мерапрыемства і ўвогуле пра скаўцкі рух нам распавялі Хрысціна ГУЛЕВІЧ і Ганна ЖУРКО.

Дэвіз: рабі як я!

Гамяльчанка Хрысціна далучылася да гэтага руху паўтара года таму: якраз у той час у горадзе распачаўся набор дзяўчат-скаўтаў (хлопчыкі збіраюцца ў Гомелі ўжо на працягу пяці гадоў). Па ўзросце, а зараз Хрысціне 17 гадоў, наша гераіня трапіла ў «Зялёную галіну» — скаўтынг для падлеткаў. Сёлета дзяўчына паступіла ў БНТУ, але пакідаць рух не збіраецца.

Кожны скаўт вучыць іншых майстэрству на ўласным прыкладзе. «Трэба ўмець і палатку паставіць, і агонь распаліць, і абед прыгатаваць.

— Скаўтынг — гэта развіццё асобы, духоўнае і фізічнае, — тлумачыць Хрысціна. — Наш рух арыентаваны перш за ўсё на рэлігію. Напрыклад, мы разам абмяркоўваем асобныя ўрыўкі з Біблії, прапануем сваю дапамогу людзям.

Беларускія скаўты ў кожную пару года выязджаюць пажыць на прыродзе альбо ладзяць пілігрымкі да каталіцкіх святынь. Так яны прывучаюць сябе жыць у «дзікіх умовах» — традыцыя пачалася яшчэ ад заснавальніка руху Роберта Бадэна-Паўэла, які рыхтаваў будучых «разведчыкаў» у лесе. Кожны скаўт вучыць іншых майстэрству на ўласным прыкладзе. «Трэба ўмець і палатку паставіць, і агонь распаліць, і абед прыгатаваць, — распавядае Хрысціна. — Усе разумеюць: калі нехта не зробіць сваю справу, то астатнія застануцца ні з чым — варта думаць і пра іншых».

Дзяўчына адзначыла, што спачатку будучыя «разведчыкі» жылі ў палатках на лецішчы, каб прызвычаіцца да новых умоў, а пасля сталі «вылазіць» у лес. У сваім кап'і — так называецца малая група скаўтаў да 9 чалавек — Хрысціна адказная за гатаванне, бо гэта ў яе добра атрымліваецца.

Адпачынак ці... выпрабаванне?

Глабальны лагер скаўтаў «Еўраджэм» праводзіцца раз на дзесяцігоддзе, і сустрэча гэтым летам была чацвёртай па ліку. Скаўты з усёй Еўропы сабраліся разам на 10 дзён у нармандскім лесе. «Еўраджэм» — гэта сустрэча скаўтаў з розных краін з мэтай пазнаёміцца і падзяліцца вопытам, знайсці агульную мову», — кажа Хрысціна. Але праблемы з моўным пытаннем узнікалі: мала хто з моладзі ведаў добра англійскую. Скаўты з іншых краін былі больш вопытныя і навучылі беларусаў некаторым «фішкам»: напрыклад, італьянцы паказалі, як прасцей зрабіць паходны стол і навучылі завязваць цікавыя вузлы.

«Мы прыехалі за некалькі дзён да афіцыйнага адкрыцця «Еўраджэма», каб разбіць лагер, — распавядае дзяўчына. — Кожны дзень нам прапаноўвалася некалькі варыянтаў праграм, і мы маглі выбіраць для сябе занятак. Так, першы дзень быў актыўным — скаўты шмат гулялі, танцавалі і зрабілі прэзентацыю Беларусі, бо многія не ведалі пра нашу краіну. Разам з «разведчыкамі» з іншых краін мы развучылі і праспявалі «Купалінку» і добра пацешыліся падчас народнай гульні «Ручаёк». Пасля такога ўсе добра паразумеліся».

Нашы дзяўчаты-скаўты ў агульнаеўрапейскім лагеры «Еўраджэм-2014».

У вольны дзень скаўты наводзілі парадак у сваім лагеры. Дадаткова яны павінны былі «выканаць» місію — дапамагчы мясцовым жыхарам, зрабіўшы частку іх працы, альбо зрабіць генеральнае прыбіранне ў касцёле. Аднак у той дзень ішоў моцны дождж, і праца «адмянілася», «разведчыкі» сядзелі па палатках. Пасля скаўты пайшлі на ферму, дзе трымаюць коней. Але замест прыбірання стайні атрымалася добрая экскурсія.

Ганна ЖУРКО па-іншаму ўбачыла лагер. «Еўраджэм» не стаў для мяне забавай, — прызналася суразмоўца. — Гэта было вялікае выпрабаванне: пяць дзён з сямі ішоў дождж! А тут яшчэ і працаваць трэба, і ў дзяўчат агонь на кухні не распальваецца — проста жах! Пасля прыйшло разуменне, што вось яно, фарміраванне твайго характару, індывідуальнасці, тэхнічных уменняў.

Мне здаецца, што гэтая сустрэча з усімі яе выпрабаваннямі прайшла б для мяне лягчэй, калі б я паспела прайсці праз тое, праз што праходзяць дзяўчаты і хлопцы ў скаўтынгу, у падлеткавым узросце. Затое пасля «Еўраджэма» цвёрда вырашыла, што хачу працаваць у «Зялёнай галіне» руху».

Рух скаўтаў з'явіўся ў 1907 годзе ў Вялікабрытаніі — у жніўні быў арганізаваны першы скаўцкі лагер на востраве Браўнсі. Афіцэр кавалерыі Роберт Бадэн-Паўэл пачаў распрацоўваць новы метад працы ў малых групах для навучання сваіх салдат і заадно рыхтаваў маладых скаўтаў, альбо разведчыкаў. Сучасны скаўтынг (Федэрацыя скаўтаў Еўропы) падзяляе педагогіку на тры ўзроўні, або «галіны», у залежнасці ад узросту ўдзельніка. Малодшая «Жоўтая галіна» разлічана на дзяцей 10—12 гадоў. «Зялёная галіна» — гэта педагогіка для падлеткаў. Старэйшая «Чырвоная галіна» разлічана на дзяўчат і хлопцаў ва ўзросце ад 18 гадоў.

На Беларусі гэты рух з'явіўся каля 12 гадоў таму. Сёння колькасць прадстаўнікоў каталіцкага скаўтынгу налічвае больш за 500 чалавек. Скаўты працуюць пры парафіях у Мінску, Гомелі, Гродна, Віцебску, Івянцы, Лынтупах, Паставах, Барысаве. Стаць скаўтам можа кожны, хто належыць да каталіцкай царквы і мае ахвоту і жаданне развівацца самому і дапамагаць у развіцці іншым. Грашовы ўнёсак складае 30 тысяч рублёў за год.

Чым здзівіла Францыя?

Беларускія скаўты дабіраліся да Францыі на аўтобусах праз Польшчу — першую ноч яны правялі ў Гнезна. Праездам былі ў Парыжы, дзе гулялі дзевяць гадзін. «Здаецца, не так і многа, але за гэты час мы шмат усяго ўбачылі, а галоўнае — Нотр-дам-дэ-Пары», — дзеліцца ўражаннямі Хрысціна. Абавязковымі пунктамі наведвання сталі Эйфелева вежа, Елісейскія палі і Луўр.

Амаль увесь час «разведчыкі» правялі ў нармандскім лесе, але здараліся вылазкі і да святых мясцін. Адна з іх — горад Лізьё, які стаў паломніцкім цэнтрам дзякуючы святой Тэрэзе — кармеліцкай манахіні. «З усёй вандроўкі мне найбольш запомнілася базіліка, пабудаваная ў гонар святой Тэрэзы, дзе зараз захоўваюцца яе мошчы, — распавядае Хрысціна. — Вядома, сабор Парыжскай Божай Маці — шыкоўнае месца, але мала хто ведае пра гэтую базіліку. Вялікая царква са званіцамі выглядае надзіва лёгкай, «паветранай» і вельмі прыгожай, як звонку, так і ўнутры».

На долю скаўтаў выпала пілігрымка па Нармандыі працягласцю ў восем кіламетраў. Яна выдалася цяжкай, бо падлеткі ўвесь час падымаліся ўгару — сапраўднае выпрабаванне для дзяўчат.

«Нягледзячы на прыгожую старажытную архітэктуру, мяне надта здзівіла, што ў Францыі вельмі брудна, — адзначыла Хрысціна. — Пасля Беларусі бачыць брудныя парыжскія вуліцы было непрыемна».

Абедзве дзяўчыны спадзяюцца наведаць наступны «Еўраджэм», які адбудзецца праз дзесяць гадоў. Па ўзросце яны перайшлі ў «Чырвоную галіну» скаўтынгу.

Кацярына РАДЗЮК.

Трэці працоўны

ЛЕТА Ў КРАІ АЛЕНЯВОДАЎ,

або Занятак для сабраных і адказных

Студэнт пятага курса Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (спецыяльнасць «Водазабеспячэнне, водаадвядзенне і ахова водных рэсурсаў») Арцём ЗЫКАЎ сёлета ўжо ў трэці раз ездзіў працаваць на паўвостраў Ямал у складзе студатрада БРСМ. Сваімі ўражаннямі ён падзяліўся з «Чырвонкай».

— Пасля другога курса я шукаў падпрацоўку на лета, — узгадвае Арцём. — Была магчымасць стажыравацца ў якасці круп'е, але нечакана пазваніў сябар і прапанаваў працу на Ямале. Нядоўга думаючы, я пагадзіўся. На паўвостраве правёў 74 дні — амаль усё лета. Пра «канікулы» не пашкадаваў, на наступны год зноў паехаў на Ямал. А гэтым летам у мяне была апошняя магчымасць папрацаваць у студатрадзе.

Першы раз Арцём ездзіў працаваць ад украінскай фірмы, пасля — ад расійскай. Занятак мяняўся: калі ў мінулыя разы яго брыгада ўкладвала плітку і фарміравала адкосы будучай трасы, дык гэтым летам студатрадаўцы капалі траншэі, адпампоўвалі ваду, разгружалі будаўнічы ўцяпляльнік, працавалі з нівелірам. «Праца не патрабавала асаблівых уменняў — махай сабе рыдлёўкай, — канстатуе студэнт. — А вось укладка плітак — больш складаны занятак, які патрабуе сканцэнтраванасці». На маё пытанне, ці шмат засталося працы на Баваненкаўскім радовішчы, Арцём толькі ўсміхнуўся: «Будоўля яшчэ не хутка скончыцца».

Гэтым летам на Ямале працавалі 50 беларускіх студэнтаў. Арцём шчыраваў на будоўлі крыху больш за месяц — 41 працоўны дзень, без выхадных. Сам ён апісаў свае будні так: «Кожны дзень як панядзелак». Жылі беларускія будаўнікі ў перасоўным вагончыку па чацвёра. У мабільным «дамку» была нават кухня. Працоўны дзень — 10 гадзін, сняданак, абед і вячэра заўжды па раскладзе. А восьмай вечара — доўгачаканы душ, пасля якога — вольны час. Але якія забавы ў тундры?

Беларускія студатрадаўцы на Баваненкаўскай будоўлі.

— Першыя тыдні моцна сумаваў: вакол толькі лес, — распавядае Арцём. — Калі хочаш свята — стварай яго сам, але гэта не значыць, што усё так дрэнна было. Сёлета, напрыклад, арганізавалі сваімі сіламі канцэрт «Адкрыццё цаліны», а летась хлопцы часта іграліся на гітары. Шчыра прызнаюся, лепшым адпачынкам — а ў кожнага сваё ўяўленне пра ідэальны вольны час — для мяне быў сон. Але не ўсе падзялялі маю думку, і таму за тры гады тут з'явіўся самаробны трэнажорны зал: хлопцы самастойна зрабілі гантэлі і турнікі. Дарэчы, мы не так ужо моцна стамляліся, таму сілы на дадатковыя фізічныя нагрузкі яшчэ заставаліся. Акрамя таго, бавілі час за шашкамі і шахматамі, чыталі, глядзелі на ноўтбуках фільмы.

Што цікава, не адны хлопцы прыехалі на асваенне цаліны: дзяўчаты таксама працуюць на студэнцкай будоўлі, але іх зусім мала. Дапамагаюць яны ў асноўным у сталовай ці разбіраюцца з дакументацыяй. Праўда, усе расіянкі.

А як з надвор'ем? Па назіраннях Арцёма, тэмпература +5 на Ямале адчуваецца як наш «нуль». Сёлета было няшмат дажджоў, а летась усе пакутавалі ад анамальнай спёкі +42.

— Беларускія краявіды мне больш даспадобы, — адзначае суразмоўца. — Хаця тундра, вядома, мае свой каларыт: здаецца, нібыта неба «вісіць», быццам збіраецца на цябе ўпасці. Кажуць, што ўвосень тут увогуле цудоўна, шкадую, што не трапіў на паўвостраў на ўвесь сезон. Затое ў гэты раз пазнаёміўся з рабочым з Омска, з якім хадзілі разам на прагулкі ў тундру: апраналіся цёпла, бралі з сабой тэрмасы — у лесе добра. Здалёк бачылі аленяў. А славутае паўночнае ззянне сёлета не пашанцавала ўбачыць, хоць летась захапляўся гэтай прыроднай з'явай.

ДАВЕДКА

Трэцяя ўсерасійская студэнцкая будоўля «Баваненкава-2014» сабрала моладзь з Расіі і Беларусі — усяго больш за 500 чалавек. Баваненкаўскае нафтагазакандэнсатнае радовішча знаходзіцца на паўвостраве Ямал за 40 кіламетраў ад Карскага мора. Названа ў гонар геолага Вадзіма Баваненкава.

Кантактаў з мясцовымі жыхарамі не здарылася, аднак непадалёк ад месца працы была іх стаянка. Тут жывуць качавыя народы — ненцы, комі, якія пераганяюць статкі аленяў. Аленяводаў налічваецца некалькі тысяч. Прадаюць сушаную рыбу, рогі і нават тушонку з аленя, якая карыстаецца попытам у суровым краі. Але ахвоты пакаштаваць ямальскі далікатэс у хлопца не ўзнікла.

Што датычыцца аплаты, то, па мерках Арцёма, гэта сярэдні заробак за такі від працы. «Калі б вы запыталіся ва ўсіх студатрадаўцаў, ці хоча нехта вярнуцца на Ямал, напэўна, большая частка адказала б «так», — адзначыў Арцём. — Усё ж праца тут нескладаная, усё арганізавана, людзі сабраныя і адказныя».

Кацярына РАДЗЮК.

Извещение о проведении 13 октября 2014 года торгов с условиями по продаже единым комплексом имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскгрузавтотранс»

Предмет торгов (состав и сведения о продаваемом имуществе)	- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-5932, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 7 («административно-производственный корпус А 1/к; Б 1/к» общей площадью 544 кв. м); - капитальное строение с инвентарным номером 500/С-13097, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, 7/1 («производственный корпус № 2 с пристройкой В 1/к; Г 1/К» общей площадью 137 кв. м); - тепловая сеть, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 7; - сеть электроснабжения, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 7; - дворовые сооружения, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 7 (инвентарный номер 000119).
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер – 500000000003000226, площадь – 0,1934 га
Продавец имущества	ОАО «Минскгрузавтотранс», ул. Минина, д. 21, к. 2, 220014, г. Минск
Организатор торгов	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)	6 687 268 000 рублей
Сумма задатка	600 000 000 белорусских рублей
Условие торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов
Наличие обременений	Аренда

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскгрузавтотранс», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **13 октября 2014 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **12.09.2014 по 09.10.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36
(УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017) 226-24-11, (029)685-04-58
(ОАО «Минскгрузавтотранс»).

В **суд Речицкого района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим Конанихина Владимира Александровича, 27 ноября 1983 года рождения, уроженца д. Черничи Житковичского района Гомельской области, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская область, Речицкий район, д. Вышемир, ул. Мира, д. 12.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2-х месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Конанихине Владимире Александровиче.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 13 октября 2014 года в 11.00 ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ТОРГОВЫХ КИОСКОВ

Организатор аукциона: РУП «Белсоюзпечать».
Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Володарского, 16, к. 400.
Контактные телефоны: 8-017-327-46-94, 8017-289-13-24.

ЛОТ № 1. Наименование предмета аукциона: Торговый киоск, инвентарный номер 100603, 2006 года выпуска. Начальная цена предмета аукциона 4 584 791 рубль.
Размер задатка для участия в аукционе: 700 000 рублей.
ЛОТ № 2. Наименование предмета аукциона: Торговый киоск, инвентарный номер 100544, 2004 года выпуска. Начальная цена предмета аукциона 3 196 073 рубля.
Размер задатка для участия в аукционе: 500 000 рублей.
Продавец имущества: РУП «Белсоюзпечать», г. Минск, ул. Володарского, 16, к. 203. Контактные телефоны: 8017-327-46-94, 8017-289-13-24.

Место нахождения предмета аукциона: г. Минск, ул. Притыцкого, 64в.

Расчетный счет для внесения суммы задатка: Назначение платежа – Задаток для участия в аукционе (без НДС). Расчетный счет № 3012102694011 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369, г. Минск, пр-т Машерова, 80.

УНП 100071552, ОКПО 14795291.

Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе: г. Минск, ул. Володарского, 16, кабинет 401, ежедневно в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 16.30, по 10 октября 2014 года до 10.00.

К заявлению прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. В случае письменного отзыва данного заявления либо неявки участника торгов на торги сумма внесенного им задатка возвращается организатором торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН: Подписать протокол о результатах аукциона. В течение 3 рабочих дней обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением, предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. После совершения победителем аукциона названных действий не позднее 7 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона, в установленном порядке заключить с продавцом договор купли-продажи имущества. В случае отказа или уклонения единственного участника торгов от возмещения затрат на организацию и проведение торгов, заключения договора купли-продажи предмета торгов внесенный им задаток возврату не подлежит.

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 609 от 12.07.2013 года.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	- Капитальное строение, инв. № 420/С-4164 (назначение – здание административно-хозяйственное, примечание – административное здание), общей площадью – 165,4 кв. м, г. Лида, ул. Калинина, 45. - Капитальное строение, инв. № 420/С-45379 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание диспетчерской), г. Лида, ул. Калинина, корп. 1, общей площадью – 92,6 кв. м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-44466 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание заправочной), г. Лида, ул. Калинина, 45, корп. 7, общей площадью – 20,1 кв. м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-44469 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – здание калориферной), г. Лида, ул. Калинина, 45, корп. 5, общей площадью – 12,4 кв.м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-4168 (назначение – здание специализированное транспорта, примечание – двухэтажное панельное здание гаража № 2), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 1141,5 кв.м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-4163 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 345,3 кв.м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-4165 (назначение – здание нежилое, примечание – здание агрегатное, топливное отделение, электроцех, котельная), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 641,7 кв.м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-47232 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – насосная), г. Лида, ул. Калинина, 45, корп. 6, общей площадью – 18,6 кв.м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-4166 (назначение – здание нежилое, примечание – трансформаторная подстанция), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 19,6 кв.м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-47234 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство), г. Лида, ул. Калинина, сооружение благоустройства производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», общей площадью – 12628,0 кв.м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-46844 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), г. Лида, ул. Калинина, водопроводная сеть на производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», протяженностью – 128,3 м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-46843 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), г. Лида, ул. Калинина, канализационная сеть на производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», протяженностью – 121,59 м. - Капитальное строение, инв. № 420/С-50292 (назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – крановая эстакада), г. Лида, ул. Калинина, крановая эстакада на производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», общей площадью – 0,0 кв.м. - Зеленые насаждения, г. Лида, ул. Калинина, 45. - Электрическая сеть.
Местонахождение объекта	г. Лида, ул. Калинина, 45
Лот расположен на земельном участке	Кадастровый номер 423650100013001252, площадью 1,8513 га (назначение – земельный участок для обслуживания производственной территории) по адресу: г. Лида, ул. Калинина, 45
Примечания	Имеются ограничения со стороны 3-х лиц в виде аренды.
Начальная цена продажи	3 325 842 432 (три миллиарда триста двадцать пять миллионов восемьсот сорок две тысячи четыреста тридцать два) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	166 292 122 (сто шестьдесят шесть миллионов двести девяносто две тысячи сто двадцать два) белорусских рубля
Продавец	ОАО «ГродноАТЭП», 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 109, тел. 520234
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 23 сентября 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.	
К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. **Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 24.06.2014 г.**	
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)	
Последний день приема заявлений – 17 сентября 2014 г. до 15.00.	

Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Друкуецца ў «Маладосці»

Як коратка апісаць тэматыку твораў Уладзіміра Мажылоўскага? Заўсёды на гістарычныя тэмы і заўсёды пра каханне — «караткевічаўскае» спалучэнне, якое, такім чынам, мае варты працяг. Апавяданне «Апошні дзень восені», поўны тэкст якога можна прачытаць у № 8 часопіса «Маладосць», пісалася з мэтай сказаць, што ад вайны, на якое б стагоддзе яна ні прыпала, больш за ўсё пакутуе каханне.

Уладзімір МАЖЫЛОЎСКІ

Урывак з апавядання

АПОШНІ ДЗЕНЬ ВОСЕНІ

1

ТРЫВОЖНАЯ вестка параненай птушкай уварвалася ў спакойнае, размеранае жыццё Мішневіч — невялікага, на дваццаць пяць двароў, паселішча, што адным бокам прытулілася да мелкай, але свавольнай Обалі. Каваль Фёдар Сапун, які ездзіў да свайго цесця ў Храпавічы, па вяртанні паведаміў, што тры дні таму памёр тамтэйшы пан Васіль і што пахавалі яго на мясцовых могілках побач з раней загінуўшым бацькам.

Вестка не Бог ведае якая важная — кожны дзень на Полаччыне паміралі людзі, але, атрымаўшы яе, гаспадарыня Мішневіч пані Арына адразу збялела, абмякла — быццам вядро ледзяной вады знянацку вылілі на яе плечы. Хваля пякучага холаду ахінула яе нутро, да горла падкаціў адчай. Да самай глыбіні душы дабраўся холад, і яна каторы ўжо раз за апошнія гады адчула сябе маленькай пясчынкай на шырокай пыльнай дарозе, бездапаможнай, пакінутай, нікому не патрэбнай на гэтым свеце. Вестка каваля абарвала апошнюю нітачку, нават не нітачку — павуцінку, што яшчэ падтрымлівала яе кволае жаданне жыць. Гора, адчай, жаль да сябе, свайго знявечанага жыцця, злосць і нянавісць да сваіх крыўдзіцеляў — усё раптоўна абрынулася ў яе нутры са сваіх палічак, змяшалася ў адзін балючы камяк, пачало выпальваць вантробы, ірваць сэрца, спазмамі сціскаць горла. Яна ледзьве стрымала дзікі крык, які вырваўся з яе сэрца і, змятаючы ўсё на сваім шляху, ірвануўся вонкі. Закрыўшы далонямі твар, да крыві закусіўшы вусны, няцвёрдымі крокамі смяротна хворага чалавека яна накіравалася ў адзінае месца, дзе яшчэ магла знайсці нейкае суцяшэнне свайму гору. Гэтым месцам была невялікая каплічка на яе двары. Там, распрасцершыся ніц на халоднай, выкладзенай дзікім каменнем падлозе, яна выпусціла таго шалёнага звера, што з лютасцю раздзіраў яе грудзі. Працяглым стогнам вырваўся гэты звер на волю, ударыўся аб адну сцяну каплічкі, аб другую, адскочыў ад трэцяй і пад гарачыя словы жаночай малітвы абязволіўся, заціх. А пані малілася. Малілася і прасіла Бога дапамагчы ёй вытрымаць, не зламацца, не здрадзіць свайму каханню, прабачыць таго, хто раструшчыў яе жыццё і хто быў для яе самым ненавісным чалавекам. Ці чалавекам? Кім быў асабіста для яе вялікі князь маскоўскі — чалавекам ці вылюдкам? На гэтае пытанне яна не магла адказаць вось ужо больш за пятнаццаць гадоў. Пятнаццаць гадоў выбеленага жыцця! Быццам і не было яго, быццам і не жыла! Але жыла. Жыла і кожны дзень чакала, што з наступнай раніцы жыццё зменіцца, спадзявалася на гэта, верыла. А тут усё разам абрынулася — і вера, і спадзяванне, і надзея.

Прыціхла вёска, прыціх панскі двор. Пані знаходзілася адна ў сваёй каплічцы, дзе кожны гук, кожны шорах узбуджаў у ёй пакутлівыя прадчуванні жорсткай незваротнасці, яна зноў і зноў падала на калені, заходзілася ў вар'яцкім галашэнні і малілася, малілася, малілася. Малілася апантана, да бяспамяцтва, да поўнага знясілення. Глыбокая пашана, святая адлучанасць ад усяго зямнога нябачнымі прамянямі зыходзілі ад яе, і яна сваім аголеным сэрцам адчувала, якім чыстым і цнатлівым павінен быць Божы свет, у якім павінны жыць людзі. І ў той жа час, у думках наноў перажываючы сваё жыццё, яна адчувала страх ад бязвыходнасці, аднастайнасці, пакорлівасці і ўбогасці таго свету, які стварыў для сябе чалавек і ў якім ён жыве. Яе перапаўняў боль ад таго, што яна не змагла змірыцца з гэтай змрочнай, змучанай душэўнымі пакутамі і доўгім маленнем. Твар яе быў шэрым, бы дрэнна выбеленае палатно, вялікія чорныя вочы ўваліліся і нагадвалі дзве адтуліны ад куль, вакол куткоў вуснаў утварылася густая сетка дробных маршчынак. Аднак яна ўсё роўна заставалася прыгожай. Ні няшчаснае замужжа, ні працяглае ўдаўства, ні яе пустэльніцтва не маглі перамагчы яе душы і цела. Да гэтага дня яна шчыра верыла ў сваё шчасце, берагла сябе, таму па-ранейшаму заставалася здаровай і велічнай.

Убачыўшы пані, служкі схілілі галовы. Арына некалькі імгненняў няўцямна глядзела на іх, потым кволая ўсмешка расцягнула яе вусны.

— Пойдзем спаць, дзяўчаты, — замагільным голасам прагаварыла яна і накіравалася да спальнага пакоя.

2

Успальні панаваў змрок. Адзіная свечка, што стаяла ля ложка, даўно аплыла і амаль не давала святла — толькі кідала на сцены няроўныя, палахлівыя цені.

— Зрабіце святлей, — загадала гаспадыня, і пакуль адна са служак мяняла свечку, пацікавілася:

— Што новага ў вёсцы?

— У Фёдарыхі сёння мядзведзь-бадзяга мужыка ў лесе задраў, да канца супрацьстаяць злу, хоць і працівілася яму ўсё жыццё; што была пакорлівай няпраўдзе і, здаралася, заплюшчвала вочы, каб не бачыць яе, не чуць, не ведаць; што баялася і саромелася сваіх пачуццяў, берагла іх, адкладвала на потым. Ад шчымлівага пачуцця поўнай адзіноты і безвыходнасці не хапала паветра, збівалася дыханне, сціскала горла. Нясцерпна хацелася вярнуцца назад у бесклапотнае дзяцінства, адчуць на сваіх валасах мяккую далонь маці, усміхнуцца з няхітрага жарту бацькі, і разуменне нерэальнасці, немагчымасці гэтага вырывалася з яе стогнамі, выліваласяся горкімі слязьмі. Жыццё адно, і яго не пераробіш, не спыніш, назад не павернеш. Нават памылкі не ўсе можна выправіць, не ўсе грахі замаліць, а тое, што ўжо зроблена, адышло ў мінулае і чалавеку не падуладна.

Дзве служкі, якія дапамагалі ёй раздзявацца перад сном, маладыя і румяныя, поўныя жыццёвае моцы, стаялі пад дзвярыма і цярпліва чакалі.

Пані Арына выйшла з каплічкі, калі халодная ноч апошняга лістападаўскага дня шчыльна ахінула наваколле. Яна была маўклівай, дык баба бегала на рэчку тапіцца. Ледзь выратавалі гаротніцу.

— Так кахала мужа?

— Кахала ці не — не ведаю, але засталася яна адна з пяццю дзецьмі, старэйшаму з якіх яшчэ і дзесяці няма... Гора бабе адной.

— Што яшчэ? Што кажуць пра смерць пана Васіля з Храпавіч?

Адна, старэйшая, якая вазілася са свечкай, зрабіла выгляд, што не пачула пытання. Другая перастала рассцілаць ложак, выпрасталася.

— Нічога не кажуць, — голас яе гучаў няўпэўнена. — Спачуваюць толькі, што памёр рана.

— Дзіва, што яшчэ да зімы дацягнуў, — уступіла ў гутарку другая, — бо прывезлі яго з-пад Полацка ледзьве жывога, усяго пасечанага.

Пані Арына больш не стала затрымліваць служанак.

— Можаце ісці, — ледзь чутным голасам прагаварыла яна, — я сама раздзенуся. А пра Фёдарыху, Аксіння, нагадай мне заўтра раніцай.

Калі дзяўчаты выйшлі, яна, бы падкошаная, павалілася на разасланы ложак. Плечы яе затрэсліся, а цішыню спальні разадралі нечалавечыя стогны — так скуголіць ваўчыца, калі бачыць галодныя вочы сваіх ваўчанят. Аднак праз нейкі час яна усё ж суцішылася, павольна прыўзнялася, села ў ложку. Потым у цемры раздзелася, легла і з галавой накрылася коўдрай.

І адразу падзеі апошніх гадоў абрынуліся на яе вадаспадам, яна не магла нават выбраць галоўнае з успамінаў, што нахлынулі. Раней перад сном яна часта марыла аб сумесным з Васілём жыцці, уяўляла, як разам з ім будзе весці гаспадарку, выхоўваць дзяцей, ездзіць у царкву, у госці. Потым, калі прайшла чутка, што яе Васілёк загінуў пры абароне Полацка, і яе, беспрытомную і абязволеную, аддалі за пана Фёдара з Чарніцы, яна марыла аб хутчэйшай смерці, каб там, на небе, сустрэць свайго любага. Аднак і з Фёдарам у яе жыцця не атрымалася, бо загінуў ён недзе пад Улаю ў студзені шэсцьдзесят чацвёртага, і ў свае няпоўныя сямнаццаць гадоў яна стала былой нявестай аднаго і ўдавой другога. Незайздросны пачатак жыцця. Але, як вядома, кожны пачатак канцом шчаслівы, і ўсё было за тое, каб жыццё яе ўсё ж такі ўдалося, наладзілася.

У 1567 годзе вярнуўся ў Літву з маскоўскага палону былы ваявода полацкі Давойна. Разам з ім вярнулася некалькі дзясяткаў ліцвінскай шляхты, у тым ліку і Васіль з Храпавіч. Колькі было радасці! А шчасця! А надзей! Здавалася, што жыццё адновіцца, што ўрэшце спраўдзяцца яе спадзяванні, летуценні і мары. Аднак не затрымаўся шляхціц надоўга ў радавым гняздзе. Толькі і пацешыў яе адным наведваннем, і то — развітальным.

— Чакай, любая, — як зараз чуе яна яго апошнія словы. — У палон ворагу я ўжо больш не дамся.

Палічыў, пэўна, што сказаў дзяўчыне самае важнае, самае галоўнае. Сказаў і з'ехаў з дзясяткам такіх жа, як сам, у войска Радзівіла. Але і ад гэтых слоў яна ажыла. Зноў расквітнела, пачала сніць тое, што перарвала недарэчная чутка пра яго смерць.

«Божа ж мой! Пятнаццаць гадоў мінула з тых падзей, а яны стаяць перад вачыма, бы адбыліся толькі заўчора. Пэўна, і ў труну лягу разам з імі!»

Пані Арына прыўзнялася, каб ямчэй сесці, уладкавала падушкі, пашукала позіркам кут, дзе віселі абразы і дзе ледзь прыкметна міргала полымя каганца. Яна перажагналася раз, другі, трэці, закрыла твар рукамі, заплакала. На гэты раз заплакала з палёгкай, быццам там, у цёмным куце, убачыла душу таго, пра каго марыла і за каго перажывала ўсё сваё жыццё. Выплакаўшы чарговую порцыю гора, яна адкінулася на падушкі, і адразу на яе наплыла светлая, шчымлівая хмара ўспамінаў. Бы праз лёгкі вэлюм яна ўбачыла мінулае. Аказваецца, яно ніколі не знікала ў небыццё, яно жыло недзе побач, а магчыма, і ў ёй самой. Яно было напоўнена тымі ж гукамі, пахла тымі ж пахамі, гучала тымі ж словамі, і чым далей распасцірала памяць свае крылы, тым яскравей яно бачылася, тым было паўнейшым і праўдзівейшым.

3

ЛЕТА 1562 года было шчодрым на цяпло і дажджы. Усё квітнела і зелянела, бы на добрай заквасцы. Ураджай абяцаў быць добрым, і гэта ўсіх радавала.

Неяк у канцы жніўня на двор пана Андрэя Мішневіча заехалі двое конных шляхціцаў, па выглядзе — бацька і сын. Маладзейшы першым саскочыў з сядла і дапамог старэйшаму спусціцца на зямлю. Перадаўшы коней слугам, прыезджыя нейкі час абдымаліся з гаспадаром, потым па яго запрашэнні накіраваліся ў хату...

Фота Васіля ЯНЬКО.

Сусвет нашай памяці

ІХ ДУШЫ — ДАЛЁКІЯ ЗОРКІ...

...Вы чуеце мяне, салдаты з далёкіх зорак? Пэўна ж, там спакой вашы душы знайшлі... Вы чуеце мой голас? Гэта я шукаю сярод вас роднага мне чалавека. І калі вы там, у зыркліва-халодным бязмежжы вялікага Сусвету, чуеце — адгукніцеся, супакойце мяне гэтым. Вы разумееце, як гэта цяжка: чакаць, берагчы ў сэрцы надзею... Калі я ўглядаюся ў зорнае неба, мне здаецца, што я бачу цябе, мой дарагі прадзядуля, Салдат Вялікай Айчыннай вайны. Ты таксама бачыш мяне? Мне расказала пра цябе мая бабуля, твая дачка Алена Васільеўна Браткоўская. Яе аповед вяртае мяне ў першую палову XX стагоддзя.

...У 1902 годзе ў Арэнбургскай вобласці ў сям'і селяніна Васіля Кудзінава нарадзіўся сын, якога назвалі ў гонар бацькі. Ішоў час, хлопчык стаў дарослым. У 1930-я гады Васіль Кудзінаў пераехаў у Беларусь, да пачатку Другой сусветнай вайны працаваў сакратаром партыйнай арганізацыі на станцыі «Мінск-Пасажырскі». У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны яму дазволілі адправіць сям'ю — жонку з траімі маленькімі дзецьмі — у эвакуацыю: спачатку пад Маскву, а потым — у Чувашскую ССР. Сам Васіль застаўся ў Мінску: трэба было працаваць, нягледзячы на цяжкую хваробу (парок сэрца), хоць ён хацеў ісці на фронт. Але партыйнае кіраўніцтва мела адносна яго свае планы...

У маі 1942 года Васіля Кудзінава закінулі ў партызанскі край — у Плешчаніцкі раён Мінскай вобласці. Яго прызначылі камісарам атрада, камандзірам групы падрыўнікоў.

Толькі адну паштоўку атрымалі ад яго родныя. У ёй было напісана: «Знаходжуся там, адкуль вас эвакуіравалі, мае родныя...» Жонка здагадалася — у Беларусі. У 1943 годзе сям'я атрымала паведамленне, што прадзед прапаў без вестак.

Пасля вайны прабабуля звярнулася ў штаб партызанскага руху ў Магілёве, дзе ёй паведамілі, што ўсе партызаны з атрада загінулі падчас прарыву блакады. У 1980-я гады прабабулю адшукала радыстка атрада, якім камандаваў Васіль Кудзінаў. Яна расказала, што камісара паважалі ў атрадзе, партызаны любілі яго за справядлівасць, смеласць і мужнасць, таму і ў апошнім баі былі разам з ім, пайшлі ў атаку і загінулі як героі.

...Раптам сарвалася і яркаю знічкай упала да ног маіх зорка.

— Мілая, добрая мая дзяўчынка. Ты — мая праўнучка. Як гэта цудоўна! Адчуваеш: я ўсміхаюся. Імя ў цябе такое прыгожае, незвычайнае, звонкае, як вясновы капеж, як майскія світанні. Ты мая праўнучка! Я ведаю, ты вельмі любіш Радзіму, шануеш сваіх бацькоў. Ты кажаш, што мая дачка, твая бабуля, усё жыццё прысвяціла высакароднай прафесіі ўрача, а мой унук, твой тата, і сёння працуе ў бальніцы. Я ганаруся вамі, мае дарагія, я ўпэўнены: нездарма я аддаў сваё жыццё, нездарма загінулі мае сябры.

Далёкія зоркі ў вялікім Сусвеце, захавайце салдат, якія не вярнуліся з вайны, а нашчадкам іх дайце сілы памятаць, вечна памятаць...

Дзіяна БРАТКОЎСКАЯ,
вучаніца 9 класа Нягневіцкай сярэдняй школы Навагрудскага раёна.

SEX=БАЛЯСЫ

СІЛА І НЕМАЧ ІЛЮЗІЙ

...Ведаеце анекдот пра суровае беларускае лета? «Пазаўчора плечы спаліў, а ўчора ногі абмарозіў». Зусім нядаўна ўсе пакутавалі ад тэмпературных рэкордаў спёкі, а цяпер гэтак жа дружна з настальгіяй прыгадваем тыя слаўныя дзянькі. Але не трэба ілюзій: лета скончылася. Дакладна кажу, бо ёсць прыкмета: у метро зараз не праціснуцца з-за студэнтаў-першакурснікаў, якія яшчэ не навучыліся ні ў сярэдзіну вагона праходзіць, ні заплечнікі здымаць на ўваходзе ў яго. Нічога, пацерпім — навучацца. Як там жартавала наша каманда «ЧП» — фіналіст вышэйшай лігі КВЗ? У тэатры даюць «Рамэа і Джульету», як раптам прывозяць будматэрыялы — машыну дошак. У рабочых сцэны выхадны, таму акцёрам даводзіцца яе самім разгружаць, прычым, літаральна падчас спектакля. І вось калі і дзея пастаноўкі, і разгрузка тых дошак набліжаюцца да завяршэння, гучыць фраза аднаго з персанажаў: «Мужайтесь, братья, привезли цемент!..» А тэма нашых сённяшніх «Балясаў» — вышэйзгаданыя ілюзіі.

Думаю, ніхто не будзе спрачацца, што ілюзіі суправаджаюць нас усё жыццё, прысутнічаюць ва ўсіх сферах нашага існавання. Гэта своеасаблівае мастацтва таго, як можна бачыць нябачнае і не заўважаць відавочнае. Як казаў адзін з герояў камедыі «ДМБ»: «Сусліка бачыш?» — «Не!» — «І я не бачу. А ён ёсць!» Мы або жывём ілюзіямі («Трэба жыць так, каб на сацыяльныя сеткі не заставалася часу» — напісала адна дзяўчына ў «Твітары»), або змагаемся з імі («Пасля навагодніх свят дзве бяды — люстэрка і вага...», «Мяне белае таўсціць» — «Дык ты не еш»). Або самі сабе іх ствараем («Мужчына, які скончыў школу з залатым медалём, а ВНУ з дыпломам з адзнакай і які атрымліваў 100 долараў у месяц, усё ніяк не адважваўся сказаць сыну: «Вучыся добра, сынок»), або «вядзёмся» на чужыя («Калі ты прыгожая, разумная і цікавая, а ў цябе няма хлопца, можа быць, хопіць верыць маці, што ты прыгожая, разумная і цікавая?»). Самы просты прыклад нашых ілюзій: пачаць «новае жыццё» з панядзелка, з першага чысла, пасля дня нараджэння, адразу пасля Новага года — патрэбнае падкрэсліць. Што, не так? Толькі ці ў многіх атрымлівалася давесці задуманае да лагічнага завяршэння? Ведаеце анекдот? «Я заўсёды хаджу ў трэнажорную залу па аўторках. Пасля панядзелка тут ніколі нікога не бывае».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

...Першае нешчаслівае каханне — трагедыя. Ці яе ілюзія? Бо тое, што нас не забівае, робіць нас мацнейшымі. Але паспрабуй патлумачыць гэта таму, для каго першае каханне ўяўляецца і апошнім? На вяселлі сведка ўздымае тост: «На жаль, я зусім не ведаю жаніха, таму не магу павіншаваць нявесту. Але я вельмі добра ведаю нявесту, таму не магу павіншаваць жаніха...» Ці так вось яшчэ можа быць. У Волі былі два кавалеры: інжынер Пеця і журналіст Саша. Каму з іх пашчасціла? Сашу, бо Воля выбрала Пецю. Але, з іншага боку, некаму такая пераканаць надае сілы змагацца за пачуцці, дабівацца свайго. (У мільярдэра пытаюцца, як у яго атрымалася зарабіць столькі грошай. Ён адказвае: «Усё вельмі проста. Мне проста хацелася ведаць, калі нарэшце маёй жонцы іх хопіць»).

...Неяк ехалі ў госці за горад разам з сямейнай парай. У дарозе ім патэлефанавала дачка. Сказала, што яны адзначылі ў кавярні дзень нараджэння сяброўкі, а цяпер яна просіць дазволу бацькоў прывесці ўсю кампанію да іх дадому, каб яшчэ крыху павесяліцца. Пачуўшы тое, бацька змяніўся ў твары: «Там жа будуць хлопцы!» Колькі мы не спрабавалі пераканаць Алега, што нічога страшнага ў тым няма, ён і ў гасцях заставаўся дастаткова напружаным. Здагадваецеся, чаму? Чарговы анекдот. Кожны мужчына ўхваляе секс да шлюбу. Пакуль у яго не нараджаецца дачка...

Можна пражыць усё жыццё з чалавекам і толькі тады зразумець, што перарабіць яго так і не атрымалася. Гэта была не больш чым ілюзія. Зноў анекдот у тэму. На сходзе гадоў размова сужэнцаў. Яна кажа: «Я хацела б прызнацца табе ў нечым... Даруй мне, але я насамрэч — дальтонік...» Ён адказвае: «І ты мне даруй. Мушу табе таксама прызнацца. Я — негр!» Але тут, мне здаецца, можа дапамагчы гумарыстычны погляд на сітуацыю, нават самаіронія. «Я не разумная, я вопытная. Была б разумнай — не была б такой вопытнай».

...Вы думаеце, што секс у суседа за сцяной — як у фільмах «для дарослых»? Хутчэй за ўсё — не, такі ж звычайны, як і ў вас, і ў большасці іншых. Гэта ілюзія. Якая часам можа нават пераўтварыцца ў калізію. Як у тым чарговым анекдоце. Стаяць два мужчыны, размаўляюць. Раптам бачаць — міма праходзіць эфектная бландзінка: даўганогая, з шыкоўнымі валасамі і такім жа бюстам. Адзін з мужчын з зайздрасцю выдыхае: «Мне б такую!» А другі яму спакойна ў адказ: «А ты ўяўляеш, што ёсць нехта, каму яна НА-ДА-КУ-ЧЫ-ЛА!».

Але, як казала некалі каманда КВЗ «Максімум» з Томска: «Байка павінна заканчвацца на пазітыве!» Іншымі словамі, часам карысна (памятаеце пра гумар і самаіронію?) зрабіць выгляд, што не было таго, што было («Усё апісанае ў газеце мела месца быць. Але не так, не там, не ў той час»). Таму і скончыць хацелася б на гумарыстычнай ноце. Калі жыццё падклала вам свінню — паспрабуйце разгледзець гэта як запрашэнне на шашлыкі. А калі нехта скажа вам «Мне б твае праблемы», смела адказвайце: «Ды забірай!» Самавываз, рэгулярнае папаўненне асартыменту, магчымы опт!

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«ЗАПРАГРАМУЙ СЯБЕ НА ПОСПЕХ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Папулярнасць дасягаецца рознымі спосабамі. Які шлях найбольш імпануе вам?

— Праграмаванне сябе на поспех! У мяне ёсць плакат жаданняў. Перш чым мае жаданні споўніліся і маё жыццё стала такім, якое яно цяпер, прайшло шмат гадоў. І было вельмі прыемна, калі неяк знайшла свой плакат жаданняў і насупраць сваіх запаветных мар змагла паставіць «птушачку». Усё адбылося менавіта так, як я хацела... Таму нават калі ў вас няма ні капейкі, але ёсць жаданне адкрыць найлепшы рэстаран, то вы зможаце гэта зрабіць. З'явяцца магчымасці. Напрыклад, лепшы кухар акажацца даўнім знаёмым тваіх сяброў і будзе напачатку працаваць, як і ты, на энтузіязме. А потым многае будзе залежаць ад таго, ці здолееш ты надалей заўважаць невыпадковыя выпадковасці і ці зможаш быць удзячным Богу і сусвету за тое, што маеш. Так было і дагэтуль адбываецца ў нас.

Не ведаю, ці можа музыка быць галоўным жыццёвым інтарэсам, калі не прыносіць грошай, але абсалютна пераканана, што чалавек павінен займацца толькі тым, ад чаго атрымлівае задавальненне.

— Якімі ўвогуле былі гэтыя амаль пяць гадоў творчага жыцця?

— Я лічу, што самыя яркія эмоцыі ты атрымліваеш на шляху да мэты. Сёння мне здаецца, быццам гэтыя гады — самы шчаслівы час у маім жыцці.

А падзей выпала нямала. У 2010-м пасля некалькіх акустычных канцэртаў удзельнікі гурта пераехалі ў Санкт-Пецярбург. Сакавік 2012-га — удзел у тэлешоу «Чырвоная зорка» на Першым», а ў маі — кліп на песню «Мама» сабраў мільён праглядаў на YouTube. Сёлета кліп на песню «Усміхайся» набраў ужо два мільёны. Потым конкурс «Новая хваля», дзе атрымалі не толькі станоўчыя водгукі ад калег па цэху, але і былі ўзнагароджаны спецыяльным прызам. І гэта толькі частка падзей з гісторыі жыцця калектыву, а колькі ўсяго застаецца за кулісамі...

— Што дае вам натхненне ў творчасці?

— Натхненне можна знайсці ў розных месцах і пры любых абставінах. Яно можа з'явіцца нават у гасцініцы, дзе спыняешся пераначаваць. Таксама творчы ўздым мне даюць фільмы з удзелам Одры Тату. А часам песню можна прыдумаць нават у ванне, калі ў гуку, з якім льецца вада з крана, нібы чуеш метраном.

— Якой павінна быць песня, створаная вамі, каб вы ёю ганарыліся?

— Пакуль не ведаю. Мабыць, гарманічнай. Аднак не так лёгка знайсці музыканта, які скажа, што песня атрымалася ідэальнай і можна спыніцца. Пастаянна хочацца нешта выправіць, зрабіць лепш, чым ёсць. А лепшае — вораг добрага!

— Думка, што робіце ўсё не дарэмна, наведвае падчас канцэртаў?

— Разумеем гэта і падчас канцэртаў, і пасля іх, калі, напрыклад, праглядаем пошту, а там людзі расказваюць, як пад нашы песні сустракаюцца, кахаюць, ствараюць сем'і... Жывуць! І ў такія моманты вельмі радуешся за іх і за сябе. Прафесія артыста дае табе перавагу: ты гаворыш са сцэны, і ў цябе ёсць усе шанцы быць пачутым.

— У вашых песнях гучаць прыгожыя гісторыі пра каханне. Як лічыце, калі чалавек закаханы, варта прыслухоўвацца да розуму ці да сэрца?

— Лепш радавацца за сваё сэрца, галавой разумеючы, што табе пашчасціла знайсці свайго адзінага сярод мільёнаў. А першапачаткова павінна падказаць сэрца, каго выбраць, я ў гэтым пераканана.

У пытаннях, ці дастаткова для гармоніі ў адносінах толькі кахання і як вытрымліваць баланс паміж асабістым жыццём і творчасцю, артыстка не спяшаецца выдаваць уласныя сакрэты. Але прызнаецца, што рамантыцы ёсць месца ў яе жыцці...

— Вас часта запрашаюць на спатканні?

— Часам клічуць у кіно і, што здзіўляе, у тэатр...

— Які адпачынак вам падабаецца?

Нядаўна купіла ў Беларусі кнігу Петруся Броўкі, перакладзеную на англійскую мову, з ілюстрацыямі Уладзіміра Зінкевіча. Таксама ў маёй калекцыі кнігі Антуана дэ Сент-Экзюперы і Туве Янсан, якія самі ілюстравалі свае творы, і іх малюнкі проста непаўторныя.

— Дома, каб адпачыць, мне дастаткова музыкі ў навушніках, мальберта і фарбаў. Але лепш за ўсё аднаўляць сілы на моры.

— Чула, вы збіраеце кнігі. Якія ўжо сёння ёсць у вашай калекцыі?

— Пасля кнігі Леаніда Цішкова «Як стаць геніяльным мастаком, не маючы ні кроплі таленту» я стала ставіцца да кніг ці, лепш сказаць, да іх афармлення, як да твора мастацтва. Нядаўна купіла ў Беларусі кнігу Петруся Броўкі, перакладзеную на англійскую мову, з ілюстрацыямі Уладзіміра Зінкевіча. Таксама ў маёй калекцыі кнігі Антуана дэ Сент-Экзюперы і Туве Янсан, якія самі ілюстравалі свае творы, і іх малюнкі проста непаўторныя.

— Аднойчы вы сказалі, што жаданне — гэта як малітва. Ці заўсёды чуе вас Сусвет?

— Заўсёды, таму што я веру.

Алена ДРАПКО.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар-галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.051.
Нумар падпісаны ў 19.30 10.09.2014 г.

■ Ёсць нагода

ЛЮБІМЫ ГОРАД, З ІМЯНІНАМІ!

СЁННЯ ПАСЛЯ РЭКАНСТРУКЦЫІ АДКРЫЕЦЦА АДЗІН З СІМВАЛАЎ НАШАЙ СТАЛІЦЫ — БУДЫНАК ГАЗЕТЫ «ВЯЧЭРНІ МІНСК»

І гэта толькі адна з падзей, прымеркаваных да 947-га дня нараджэння Мінска. Пра тое, што горад робіць для мінчан і што мы можам зрабіць для яго, пра ўменне бачыць станоўчае ў штодзённым і пра Мінск як крыніцу натхнення гутарым з генеральным дырэктарам інфармацыйнага агенцтва «Мінск-Навіны» Кацярынай ДУБІНСКАЙ.

— Як дэпутат Мінскага гарсавета адзначу, што па традыцыі да Дня горада мінчане атрымаюць шэраг самых розных падарункаў: прыме вучняў і настаўнікаў новая 161-я школа, атрымаюць ключы ад сваіх кватэр навасёлы, прыемныя сюрпрызы чакаюць мінчанак, якія ў гэтыя дні стануць мамамі. А якая святочная праграма падрыхтавана для мінчан і гасцей сталіцы на бліжэйшыя выхадныя! Безумоўна, паўсюдна паспець будзе немагчыма, але кожны дакладна знойдзе ў шэрагу мерапрыемстваў штосьці на свой густ. Асабіста я вырашыла, што не змагу абмінуць пляцоўку «Мінск гістарычны» на перасячэнні праспекта Пераможцаў і Машэрава, дзе адбудзецца маштабная рэканструкцыя, абавязкова наведаю ў Парку Перамогі выставу-кірмаш «Горад майстроў», адметную тым, што ў ёй бяруць удзел установы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. І як не зайсці да Уладзіміра Пракапцова ў Нацыянальны мастацкі музей, дзе, акрамя цікавых экспазіцый карцін, заўжды ў Дзень горада рыхтуецца адмысловае шоу? Або як не паглядзець на ўрачыстую цырымонію прысваення ганаровага звання «Мінчанін года»? У гэтым спісе асобныя прозвішчы выклікалі ў мяне суцэльнае захапленне. Так, за

Няпраўда, што Мінск — ціхі, спакойны горад. Так было, можа, 10–15 гадоў таму, а цяпер ён — каляровы, жывы, рухавы.

сціплым азначэннем «Шарапаў Васіль Іванавіч, пенсіянер» стаіць былы старшыня гарвыканкама, які вельмі многае зрабіў у свой час для горада, а сёлета, у свае 90 «з гакам» гадоў напісаў цудоўную кнігу ўспамінаў пра Мінск, пра тое, як яго аднаўлялі і будавалі… Радасна бачыць у спісе і нашу алімпійскую чэмпіёнку Алу Цупер, і кіраўніка будтрэста №7 Барыса Шэрмана, і гендырэктара «Белавія» Анатоля Гусарава. Такія імёны мяне, напрыклад, натхняюць, хочацца расказаць больш пра ўсіх тых людзей, якія робяць наш горад сучасным, камфортным, прыгожым…

Але мне заўжды здавалася, што мы павінны думаць не толькі пра глабальныя падарункі

для ўсіх, а і пра тое, што ты сам можаш зрабіць для любімага горада. У маім доме на вуліцы Румянцава жыве настаўніца рускай мовы, якая робіць гораду свой маленькі падарунак: яна абсаджвае дрэвы на вуліцы яркімі жоўтымі кветкамі. Здавалася б, малая справа — але гэтыя клумбы даюць такі яркі, сонечны настрой! А ёсць падарункі і вялікія — адзін з іх мы прыдумалі самі. Ужо сёння мэр горада Мікалай Ладуцька ўрачыста адкрые першую чаргу абноўленага будынка ў самым цэнтры горада — гэта будынак «Вячэрняга Мінска». У ім зроблены не толькі новы фасад, заменены вокны, але і ўнутры ўсё змянілася: гранітная падлога з надзвычай прыгожай мазаікай, люстры ў стылі 1950-х, увесь дэкор вытрыманы таксама ў гэтым стылі, бо будынак уяўляе гістарычную каштоўнасць, і абыходзіцца з ім неахайна мы не мелі права. Шчыра прызнацца, калі мы толькі пачыналі, то маштаб разбурэнняў прыводзіў у жах і здавалася, рамонт ніколі не скончыцца. Але цяпер мы бачым: вочы баяцца — а рукі спраўляюцца! І хоць Мікалай Аляксандравіч як будаўнік па прафесіі, безумоўна, заўважыць мноства нюансаў, якія можна было зрабіць лепш, але, мяркую, вынік усё ж атрымаўся вельмі варты. Да канца бягучага года завершыцца і другая чарга рэканструкцыі — ідэя ўжо набыла канкрэтныя рысы: акрамя праведзенай за ўласныя і прыцягнутыя сродкі рэстаўрацыі, мы набываем сучаснае абсталяванне і для рэдакцыі і дапаможных службаў, і для сучаснага капіравальнага цэнтра, які будзе аказваць паслугі насельніцтву. Усё думалі: што «пасяліць» у холе, на першым паверсе, каб гэта было і для душы прыемна, і карысна для горада? Вырашылі, што газетнай справе зусім не пашкодзіць водар цудоўнай кавы — і таму неўзабаве адкрыем кавярню-бар з пірагамі і пірожнымі, якія па спецзаказе выпякаць у гарналыжным комплексе «Сілічы». Каву можна будзе ўзяць навынас, а можна няспешна выпіць за столікам, гартаючы свежы нумар «Вячоркі».

Яшчэ адзін, не такі значны, але, спадзяюся, прыемны падарунак мінчанам — сёння ў апошнія рэйсы паедзе незвычайны «Кур'ерскі трамвай», які мы запусцілі сумесна з «Мінсктрансам». Напярэдадні Дня горада ўжо некалькі тыдняў ён шточацвер ездзіць па маршруце «Вакзал — Зялёны Луг», а пасажыры мала таго што едуць бясплатна, але і атрымліваюць свежыя нумары нашых газет, а таксама могуць паслухаць і пачытаць гарадскія легенды, задаць пытанні нашым журналістам, пачаставацца цукеркамі… Гэта новая мінская забава так спадабалася многім гараджанам, што пасля першых жа рэйсаў на канцавой станцыі збіралася неверагодная колькасць ахвотных пракаціцца, якую не ўмесціць ніводзін трамвай!

— На вяселлі і дні нараджэння «Кур'ерскі трамвай» яшчэ не замаўляюць?

— Пакуль што не, але думаю, усё наперадзе. Тым больш творчых ідэй і задач, якія неабходна рэалізаваць, у нас яшчэ вельмі многа. Хочацца развіваць далей партал minsknews.by, зрабіць уласнае інтэрнэт-тэлебачанне…

— Дарэчы, ходзяць чуткі, што партал холдынга «Мінск-Навіны» неўзабаве таксама істотна абнавіцца?

— Калі ты стаіш на месцы ў той час, як усе ідуць наперад — значыць, ты рухаешся назад. Таму паціху крочым наперад і мы. Практычна

гатовыя і, разлічваю, стартуюць у бліжэйшы час новыя тэматычныя дадаткі — «Мінская афіша», «Прыватныя аб'явы», шэраг іншых. Тут не трэба вынаходзіць кола. У нас ёсць «вялікі брат» — холдынг «Вячэрняя Масква», з якім, не змаўляючыся, мы практычна ідзём нага ў нагу, розніца толькі ў дробязях: напрыклад, у іх жаночы часопіс «Масквічка», а ў нас — дзіцячы часопіс «Арэлі». Наогул, новых праектаў, якія за лета прыдумалі і рыхтавалі нашы журналісты, вельмі шмат — безумоўна, не ўсе яны атрымаюць развіццё, але прыкладна 15 стартуюць неўзабаве — у «Вячэрнім Мінску», у «Мінскім кур'еры» і, безумоўна, на партале, бо газетнай плошчы для адлюстравання поўнай карціны гарадскога жыцця катастрафічна не хапае. Напрыклад, мы штотыднёва будзем ствараць банк звестак пра таленавітую моладзь; абавязкова звернемся да тэмы маладых урачоў, распавядзём пра тых медыкаў, для каго Мінск і наогул Беларусь сталі другой радзімай; пакажам педагогаў-наватараў — самаадданых, прафесійных настаўнікаў ад Бога. Бо наша агульная бяда ў тым, што сёння многія журналісты «завостраны» на пошук сенсацый і скандалаў, на «чарнуху» і «зорак» (не выношу гэтае слова!) і не заўважаюць тых людзей, якія штодзённа сваёй працай ствараюць наша жыццё. А ганарыцца насамрэч нам ёсць чым, трэба толькі гэта разгледзець. Так што, вяртаючыся да святочнай нагоды — Дня горада, — будзем ствараць святочны настрой сваімі рукамі.

— У кожнага журналіста свая тэма і свая крыніца натхнення. Вас — як кіраўніка холдынга, рэдактара, калумніста — чым натхняе Мінск?

— Я нарадзілася ў самым цэнтры Мінска — раней гэта быў Омскі завулак, цяпер вуліца Румянцава — і кожны дзень мне радасна бачыць любімую плошчу Перамогі, шырокі і светлы праспект, каляровыя аўтобусы «соткі». Няпраўда, што Мінск — ціхі, спакойны горад. Так было, можа, 10–15 гадоў таму, а цяпер ён — каляровы, жывы, рухавы. А маё натхненне жыве ў цэнтры горада. З дзяцінства для мяне вельмі хвалюючая і трапяткая падзея — паход з бабуляй, а потым з мамай, з сынам да Вечнага агню і стэлы Перамогі, што сімвалізуе ў тым ліку памяць і па маім дзеду, які без вестак прапаў на вайне… Так, я патрыёт свайго горада і не лічу, што трэба баяцца або саромецца любові да яго. Наадварот, гэту любоў у мінчанах і гасцях горада трэба ўсяляк падтрымліваць. Карыстаючыся выпадкам, яшчэ раз запрашаю ўсіх: далучыцеся ў Дзень горада да свята — і вы абавязкова ўбачыце штосьці цікавае, даведаецеся пра штосьці новае! І я ўпэўнена, што ў кожнага з'явіцца свая нагода для гонару за любімую краіну і любімую сталіцу.

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК

СОНЦА ЛАНДШАФТАЎ І КНІГ

У мінскай кнігарні «Кніжны салон» адкрылася выстава мастачкі Аксаны Аракчэевай «Вецер вандровак 2»

Здавалася б, кнігарня — не самае лепшае месца для паказу творчасці мастакоў. Але ў выпадку з «Кніжным салонам» гэта зусім не так. Ала Зміёва, гаспадыня гэтай крамы, пераканана, што літаратура, кніга і выяўленчае мастацтва — блізкія адна да другой прасторы. А жывапісец Аксана Аракчэева, якая пазнаёміла гледачоў са сваімі работамі з пленэраў, падарожжаў па Расіі, Чэхіі, Славакіі, Літве, Польшчы, Германіі, Швейцарыі, яшчэ ж і кніжны графік. У апошнія гады мо з дзясятак дзіцячых кніг у выдавецтвах «Мастацкая літаратура», «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выйшлі менавіта з яе ілюстрацыямі. Творы такіх ужо добра вядомых пісьменнікаў-казачнікаў, як Ніна Галіноўская, Генадзь Аўласенка, Таццяна Сівец, Алена Масла ў афармленні Аксаны Аракчэевай набываюць новае гучанне, узбагачаюцца самымі рознымі колерамі і адценнямі. А саміх аўтараў яшчэ падштурхоўваюць да новых фантазійных сюжэтаў.

Пра гэта якраз і гаварыла Аксана, распавядаючы, як працуе над афармленнем дзіцячых кніг: «Мне мала прачытаць тэкст і зрабіць да яго тлумачальныя малюнкі… Я стараюся даведацца ўсё, што толькі магчыма, пра тых ці іншых персанажаў, наколькі яны з рэчаіснасцю звязаны. А калі і знешні выгляд, і дзеі герояў кнігі зусім прыдуманыя, то тады даю волю сваёй фантазіі, ні ў чым сябе не абмяжоўваю. Часам складваецца ўражанне, што, выкарыстоўваючы іншыя сродкі, чым слова, дапісваю,

дапрацоўваю тую ці іншую кнігу. Здаецца, аўтары, паважаныя пісьменнікі на мяне за гэта не крыўдуюць. І тады мне хочацца таксама паставіць сваё імя на вокладцы. Няхай сабе з надпісам: «Малявала Аксана Аракчэева». Як, дарэчы, робіцца ў супольніцтве шведскіх ці фінскіх пісьменнікаў і мастакоў, якія вельмі актыўна працуюць у галіне дзіцячага кнігавыдання…»

Аксана Аракчэева не толькі сама вандруе па іншых краінах, яна яшчэ выступае арганізатарам выставак беларускіх мастакоў у Чэхіі, у галерэі старадаўняга замка ў горадзе Тржэбіч. Пра гэта гаварыў на імпрэзе ў «Кніжным салоне» мастак Павел Масленікаў — так, унук славутага Масленікава. Менавіта гэтай дынастыі была прысвечана нядаўняя выстаўка ў Тржэбічы. У адкрыцці імпрэзы ў «Кніжным салоне» прыняў удзел і пасол Чэхіі ў Беларусі. Відаць, дзякуючы падтрымцы чэшскага пасольства і дзякуючы ініцыятыве Аксаны Аракчэевай у бліжэйшы час будуць рэалізаваны новыя беларуска-чэшскія мастацкія праекты. А беларускія чытачы, будзем спадзявацца, убачаць у кнігарнях новыя дзіцячыя кнігі, афармленыя таленавітым ілюстратарам. Вітаючы Аксану Аракчэеву, пра гэта вялі размову і ўдзельнікі імпрэзы — пісьменнікі Алена Масла, Таццяна Сівец, Навум Гальпяровіч.

Сяргей ШЫЧКО.

Фота Наталлі АСМОЛы.

Marko®
– ОБУВНОЙ ХОЛДИНГ –

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ
«Марко». Приготовься

1. Организатор рекламной игры.

Общество с ограниченной ответственностью «Смарт Нова», далее именуемое «Организатор», 220002, г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, к. 11, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191720959, свидетельство о государственной регистрации выдано 04.03.2013 г.

2. Наименование рекламной игры – «Марко». Приготовься к новым маршрутам!».

3. Территория проведения – Республика Беларусь.

